В. І. Свірыдзенка

# Беларуская мова 2

Частка 1



В. І. Свірыдзенка

# Беларуская мова

Вучэбны дапаможнік для 2 класа
ўстаноў агульнай сярэдняй адукацыі
з рускай мовай навучання

У дзвюх частках

Частка 1

*Дапушчана*
*Міністэрствам адукацыі*
*Рэспублікі Беларусь*

Мінск
Нацыянальны інстытут адукацыі
2020

Правообладатель Национальный Институт образования

УДК 811.161.3(075.2=161.1)
ББК 81.2.2Беи-922
С24

Р э ц э н з е н т ы:

канд. пед. навук, дац., вядучы навуковы супрацоўнік лабараторыі пачатковай адукацыі Навукова-метадычнай установы «Нацыянальны інстытут адукацыі» Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь *М. Б. Анціпава*;

метадычнае аб’яднанне настаўнікаў пачатковых класаў дзяржаўнай установы адукацыі «Сярэдняя школа № 16 г. Мінска» (намеснік дырэктара па вучэбнай рабоце, настаўнік пачатковых класаў кваліфікацыйнай катэгорыі «настаўнік-метадыст» *Ю. В. Бялова*)

## Умоўныя абазначэнні:

— правіла;

**Завяжы вузялок!** — важная інфармацыя пра мову і маўленне (чытае настаўнік);

 — дадатковае творчае заданне, якое выконваецца па жаданні;

 — слоўнік;

— слоўнікавае слова;

Рм — заданне па развіцці маўлення;

 — выкананне задання ў электронным дапаможніку: http://qrcode.by/3lo85;

 — дамашняе заданне.

ISBN 978-985-594-569-8 (ч. 1)
ISBN 978-985-594-568-1

© Свірыдзенка В. І., 2020
© Афармленне. НМУ «Нацыянальны інстытут адукацыі», 2020

Правообладатель Национальный Институт образования

# УСТУПНЫ КУРС

## Вывучаем беларускую мову

**1.** Разгледзьце малюнкі. Якія гукі могуць утвараць адлюстраваныя на іх прадметы? Прачытайце адпаведныя спалучэнні літар.

чу-чу-чу-чу-чу

дж-ж-ж дж-ж-ж

оў-оў-оў-оў-оў

ці-ці-ці

ры-ры-ры-ры-ры

га-га-га-га-га

дзінь-дзінь-дзінь





Правообладатель Национальный Институт образования

**2.** Прачытайце.

| | | | |
|---|---|---|---|
| **ч**ас | ле**ў** | **ц**іха | **дж**эм |
| **ч**мель | ла**ў**ка | ве**ц**ер | **дж**ала |
| **р**ыс | **г**ара | **дз**ень | **шч**ака |
| **р**эпа | на**г**а | лю**дз**і | бор**шч** |

Назавіце «асаблівыя» гукі беларускай мовы, якія сустрэліся ў словах.

**3.** У якім радку словы запісаны па-беларуску? Як вы здагадаліся? Прачытайце гэтыя словы.

Ліст, Мінск, мір, Іра, сліва.
Лист, Минск, мир, Ира, слива.

**4.** Прачытайце. Вусна перакладзіце на рускую мову словы *мова, урок*. Якое слова вымаўляецца і пішацца аднолькава ў рускай і беларускай мовах?

*У нас урок. Мы вывучаем беларускую мову.*

Спішыце сказы.



Правообладатель Национальный Институт образования

**5.** Паслухайце верш. Якая птушка лічыцца сімвалам Беларусі? Выпішыце з верша яе назву.



На бярозе — белы бусел,
пад бярозаю — ручай.
А завецца БЕЛАРУССЮ
непаўторны родны край.

*А. Вольскі.*

**Рм** Якога звера лічаць сімвалам Беларусі? Дзе яго можна ўбачыць?

**6.** Вусна адкажыце на пытанні.

Як называецца наша краіна?
Як называюць жыхароў Беларусі?
Як называецца мова, на якой размаўляюць беларусы?

С л о в ы д л я д а в е д к і: *Рэспубліка Беларусь, беларусы, беларуская.*

**7.** Прачытайце. Спішыце.

Беларусь — наш родны край.



Правообладатель Национальный Институт образования

# Гук [і], літары *І, і*

*І і*

**8.** Разгледзьце малюнкі. Прачытайце спачатку назвы садавіны, потым — гародніны. Які гук абазначаецца рознымі літарамі ў рускай і беларускай мовах?




лімоны
кабачкі
буракі
вішні
апельсіны





*садавіна* *гародніна*

**9.** Запішыце літары, спалучэнні літар і словы.

*і ір ім мі іл ін іс іг*

*І Іван Іра*

**10.** Прачытайце словы пад малюнкамі.


*дыня*


*дын..*


*персік*


*персік..*



Правообладатель Национальный Институт образования



*вішня*



*вішн..*



*яблык*



*яблык..*

Запішыце словы, якія абазначаюць многа прадметаў. Падкрэсліце ў іх літару ***і***.

**11.** Паслухайце верш.

### Абжора

— Ой, які ў цябе жывоцік!
Што ясі ты, бегемоцік?
— Я спярша, мае сябры,
з’еў бананаў тры вядры,
апельсінаў з’еў паўбочкі,
мандарынаў — два мяшочкі,
соку выпіў вёдраў сем...
Вось пасплю і болей з’ем.

*Д. Вінаградаў.*

Якую садавіну любіць есці бегемоцік? Чаму аўтар называе яго абжорам?

Знайдзіце і прачытайце словы з літарай ***і***.



Правообладатель Национальный Институт образования

**12.** Прачытайце подпісы пад малюнкамі. «Збя-рыце» ў кошык гародніну, у назве якой ёсць ***і***.


*буракі*


*памідоры*


*баклажаны*


*морква*





*фасоля*


*агуркі*


*капуста*


*радыска*

Запішыце словы з літарай ***і***.

**13.** Дапоўніце сказы словамі.

Між галін віселі сакавітыя  .

У бабулі выраслі  .

Запішыце сказы.



Правообладатель Национальный Институт образования



**14.** Прачытайце скорагаворку і навучыцеся правільна вымаўляць яе.

Поле Павел буракі, а Ларыса — агуркі.

Выпішыце словы з літарай ***і***.

**15.** Прачытайце назву верша і разгледзьце малюнак да яго. Пра якую пару́ года пойдзе размова ў творы? Паслухайце верш.

## Гародніна і садавіна

Гародніна
і садавіна
з восеньскага
лімузіна:
грушы, морква,
кабачкі,
слівы, бручка,
буракі,
бульба, яблыкі,
хурма,
гарбузы.
І ўсё — дарма.





Правообладатель Национальный Институт образования

Дзеці, вы сказаць павінны:
што — гародніна,
што — садавіна?

*Н. Галіноўская.*

Чаму садавіна і гародніна едуць у «восеньскім лімузіне»?

Выпішыце назвы садавіны і гародніны з літарай ***і***.

**16.** Прачытайце тэкст.

Міша і Міла едуць у Іванава. Там жыве бабуля. У яе свой дом. За домам вялікі сад. Там растуць яблыні і слівы. Бабуля чакае ўнукаў.

Перачытайце сказы, у якіх ёсць словы з літарай ***і***. Выпішыце той сказ, у якім больш слоў з літарай ***і***.

**17.** Прачытайце, дапаўняючы словы гукам [і].

| | | |
|---|---|---|
| М..к..та | ..гар | ..вянец |
| Ал..на | ..на | М..нск |
| В..ктар | ..рына | ..вацэвічы |



Правообладатель Национальный Институт образования

Выпішыце словы, у якія трэба ўставіць вялікую літару ***І***.



Успомніце назвы гарадоў і вёсак Беларусі, у якіх ёсць літары ***І, і***.

**18.** Прачытайце і адгадайце загадку. Запішыце слова-адгадку.





І спінку мае,
і вушка мае,
і носік мае,
і хвосцік
за сабой цягае.
*У. Мацвеенка.*



Пакажыце на малюнку тую іголку, пра якую ідзе размова ў загадцы.

**19.** Прачытайце скорагаворку. Хто такі налім? Чаму яго цяжка злавіць?



Ігар і Іра лавілі наліма.
Ды слізкі налім няўлоўны зусім.
*А. Зэкаў.*

Назавіце словы з літарай ***і***. Выпішыце тыя з іх, у якіх ёсць некалькі літар ***і***.



Правообладатель Национальный Институт образования



**20.** Прачытайце. Спішыце. Падкрэсліце ў словах літару ***і***.

У Ноны і Ніны — ніткі і тканіна. *(С. Шах.)*

## Апостраф (’)

**21.** Прачытайце словы.

*верабей* *вераб’і*



Якім з прапанаваных слоў можна падпісаць малюнак? Назавіце па парадку гукі ў гэтым слове. Які знак пішацца ў слове *вераб’і*?

**Завяжы вузялок!**

Апостраф не літара, а надрадковы знак.

Там, дзе ў слове стаіць апостраф, пры чытанні вымаўляецца гук [й].

**22.** Запішыце словы з апострафам.

*б’е п’е вераб’і пер’е сям’я*

*Дар’я Мар’я Мар’іна*



Правообладатель Национальный Институт образования

**23.** Прачытайце. Які знак ёсць ва ўсіх словах?

| | | |
|---|---|---|
| з’езд | б’е | пер’е |
| аб’езд | п’е | вераб’і |
| пад’езд | з’ем | вераб’іны |

З адным словам вусна складзіце сказ.

**24.** Прачытайце верш. Што такое апостраф?

## Апостраф

Вось апостраф. Гэта знак.
Вельмі важны ён аднак.
*З’езд*, *пад’езд* напішам проста,
Калі ўспомнім пра апостраф.

*А. Вольскі.*

Выпішыце словы з апострафам.

**25.** Прачытайце загадку.




З вераб’інае яечка
ён велічынёю,
а жыве тут дуб вялізны
да хмар вышынёю.

*І. Муравейка.*

З літар складзіце слова-адгадку. Выпішыце з загадкі слова з апострафам.



Правообладатель Национальный Институт образования



**26.** Паслухайце верш.

## Рассмяшыў Вася

Рассмяшыў сягоння ў класе
нас сваёю байкай Вася.
Ён сказаў: «З сястрычкай Дашай
салаўя кармілі кашай.
Салавейка кашу з’еў,
чык-чырык — на грушу сеў».
Мы ўсім класам закрычалі:
«Вераб’я вы частавалі».

*В. Кудлачоў.*

Якіх птушак пераблытаў Вася? Як дзеці здагадаліся, што Вася частаваў вераб’я?

Знайдзіце і прачытайце словы з апострафам.

**27.** Дапоўніце сказы патрэбнымі словамі.

| | |
|---|---|
| У вераб’я вялікая ... | пер’е |
| У сарокі прыгожае ... | сям’я |

Запішыце сказы. Назавіце словы з апострафам.



Правообладатель Национальный Институт образования



**28.** Прачытайце прыказку. Чаму так гавораць?

Прыгожая птушка пер’ем, а чалавек вучэннем.

Спішыце. Падкрэсліце слова з апострафам.

## Гукі [г], [г’], літары *Г, г*



**29.** Разгледзьце малюнак. Прачытайце скорагаворку.




Пад галінамі яліны гномы гаманілі.

Прачытайце, што гаварылі гномы.

**Завяжы вузлок!**

Гукі [г], [г’] у беларускай і рускай мовах вымаўляюцца па-рознаму, але на пісьме абазначаюцца адной і той жа літарай.



Правообладатель Национальный Институт образования

**30.** Запішыце спалучэнні літар.

*га го гу гы гі гэ ге*

*Га Го Гу Гы Гі Гэ Ге*

**31.** Прачытайце словы. Правільна вымавіце гукі [г], [г’].

| | | |
|---|---|---|
| гэта | гаворы | прыгожая |
| герб | гаворка | герань |
| горад | пагавару | паглядзела |



Ці ведаеце вы, што такое герб? Якія бываюць гербы́? Якія кветкі адлюстраваны на гербе́ Беларусі?

**32.** Прачытайце назву тэксту. Разгледзьце малюнак. Як вы думаеце, якіх кветак не бывае? Паслухайце тэкст.

## Такіх кветак не бывае

Неяк гэтым летам мая суседка Таня збірала на лузе кветкі: **рамонак, гарыцвет, трыпутнік.** Яна паказвала іх мне і казала:



Правообладатель Национальный Институт образования

— Во якая прыгожая кветка!.. І гэтая прыгожая... І вось гэтая. Я занясу іх бабулі і пастаўлю ў вазу.



— А ты пашукай непрыгожую, — сказаў я. — Самую непрыгожую.

Таня ўважліва паглядзела мне ў вочы і, убачыўшы, што я гавару зусім сур'ёзна, задумалася.

— Такіх кветак не бывае, — нарэшце сказала яна. Потым яшчэ падумала, зноў паглядзела мне ў вочы і рашуча запэўніла:

— Нідзе не бывае! *(Паводле В. Гарбука.)*

Якія кветкі збірала на лузе Таня? Пакажыце іх на малюнку. Што яна казала пра кожную кветку? Чаму дзяўчынка не стала шукаць непрыгожую кветку?

Выпішыце з тэксту назвы кветак. Падкрэсліце літару ***і***. Прачытайце назву кветкі, у якой вымаўляецца гук [г].

**Рм** Як па-іншаму называецца трыпутнік?



Правообладатель Национальный Институт образования

**33.** Разгледзьце малюнкі, прачытайце словы. Назавіце адным словам прадметы на малюнках.





*званочак* *вяргі́ня* *дзьмухаве́ц*






*гладыёлус* *ружа* *астра* *гарла́чык*

Якія з гэтых кветак растуць на лузе?

Якія з іх вырошчваюць у кветніку?

Дзе расце гарлачык?

Якія кветкі вам падабаюцца?

Выпішыце назвы кветак, у якіх ёсць гукі [г] або [г’].



Правообладатель Национальный Институт образования

**Рм** **34.** Вусна раскажыце пра сваю любімую кветку. Карыстайцеся словамі ў дужках.

Мая любімая кветка — ... . У ... (*тонкая, гнуткая, доўгая, тоўстая*) сцяблінка, (*доўгія, тонкія, маленькія, зялёныя, прыгожыя*) лісцікі. Пялёсткі ў ... (*чырвонага, сіняга, блакітнага, жоўтага, ружовага*) колеру.



**35.** Прачытайце скорагаворку і навучыцеся правільна вымаўляць яе. Назавіце словы з гукам [г].

Даў Грыша Галі грушу, Галя Грышу — ягады.

**36.** Прачытайце скорагаворку. Правільна вымавіце гук [г].

На гародзе рос гарох, а за рэчкай — грэчка.

Выпішыце назвы раслін, якія сустрэліся ў скорагаворцы.



Правообладатель Национальный Институт образования

**37.** Прачытайце словы ў красвордзе. Знайдзіце адпаведныя малюнкі.




Выпішыце тыя назвы кветак, у якіх вымаўляюцца гукі [г] або [ґ'].

**38.** Прачытайце верш. Пра якія званочкі ідзе ў ім размова?

### Званочкі

На пагорку за сялом
суха, светла стала.
Сонца мяккім дываном
поле ўсё заслала.



Правообладатель Национальный Институт образования

Там пад ветрыкам звіняць
першыя званочкі.
Нас гукаюць пагуляць
на лугі-лужочкі.

*М. Чарняўскі.*



***дыва́н*** — рус. *ковёр*

Назавіце слова з гукам [г’]. Выпішыце словы з гукам [г].

**39.** Прачытайце сказ пад малюнкам. Што абазначаюць выдзеленыя словы?



Гэта **Лілія** і **Маргарыта**.





Гэта … і … .

Дапоўніце сказ пад малюнкам справа патрэбнымі словамі.

С л о в ы  д л я  д а в е д к і: *маргарытка, лілія, герань.*

Запішыце сказ, які атрымаўся. Назавіце ў ім словы з гукам [г].



Правообладатель Национальный Институт образования

**40.** Знайдзіце і прачытайце словы ў пірамідзе.

| | | | | | | | | | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| | | | | н | а | г | а | р | а | | | | |
| | | п | і | р | а | г | і | т | а | р | а | | |
| д | а | п | а | м | а | г | у | с | е | н | і | ц | а |

Запішыце словы, якія прачыталі. Падкрэсліце ў іх літару ***і***.



**41.** Прачытайце і адгадайце загадку.

Я таксама гонар маю,
вельмі кветнік аздабляю.
Я высокі, нібы колас,
і завуся … .

*С. Шах.*

гла — ды
ё — ды
ё — лус



***го́нар — пава́га, сла́ва***

Назавіце словы з гукам [г].

## Гук [ч], літары Ч, ч



**42.** Разгледзьце малюнкі. Скажыце па-руску, што на іх намалявана. Прачытайце словы, запісаныя па-беларуску.



Правообладатель Национальный Институт образования



*чай*



*чайнік*



*чайка*

Якімі гукамі адрозніваецца вымаўленне рускіх і беларускіх слоў?

**Завяжы вузялок!**

У беларускай мове гук [ч] вымаўляецца цвёрда: ***пчала, чмель, чорны.***

**43.** Запішыце спалучэнні літар і словы.

*ча чо чы чэ чу чачотка*

*Ча Чо Чы Чэ Чу Чашнікі*

**44.** Прачытайце словы. Выразна вымавіце гук [ч].

| | | |
|---|---|---|
| гучна | жучкі | чырвоны |
| гучыць | сінічкі | чорны |

Назавіце словы, якія пачынаюцца з гука [ч].



Правообладатель Национальный Институт образования

**45.** Разгледзьце малюнкі. Дапоўніце сказы словамі і запішыце. Назавіце словы з гукам [ч].



*чашачка*



*кубачак*

У кветкі прыгожая ... .
У хлопчыка прыгожы ... .

**46.** Паслухайце тэкст.

## Лівень

У лесе нечакана сыпануў дождж. Буйны́я цёплыя кроплі гучна заляскалі па траве і лісці дрэў.

І ўсе пачалі́ хава́цца ад дажджу. Жучкі, матылькі, мухі пазалазілі, хто куды: у чашачкі кветак, пад лісце, у розныя шчылінкі.

Мышка прытаілася пад чырвоным грыбам-мухаморам.

Сінічкі ў ду́плы пахаваліся.

А жабы, што сядзелі на беразе сажалкі, думалі, куды б ім схавацца, і скокнулі ў ваду.



Правообладатель Национальный Институт образования

Так і прасядзелі там, пакуль лівень не скончыўся. *(В. Хомчанка.)*

***са́жалка*** — рус. *пруд*

Што пачалі рабіць жывёлы, калі пачаўся дождж? Якія схованкі яны сабе знайшлі? Чыя схованка выклікала ў вас усмешку? Чаму?

Прачытайце, куды схаваліся ад дажджу жучкі, матылькі, мухі. Правільна вымавіце гук [ч].

Чаму тэкст называецца «Лівень»?

**47.** Прачытайце верш. З чым параўноўвае аўтар вочкі дачушкі?



### Вочкі

Сіненькія вочкі
ў маленькай дочкі.
Кажуць вочкам матылькі:
— Вы не вочкі — васількі,
а можа, званочкі?
— Не, мы — вочкі, вочкі!

*Н. Тулупава.*

Назавіце словы з гукам [ч].

**Рм** Як па-іншаму называюцца васількі?



Правообладатель Национальный Институт образования

Рм **48.** Раскажыце, якія вочы ў вашай матулі. Выкарыстайце прапанаваныя словы.

Прыгожыя, пяшчотныя, карыя, шэрыя, блакітныя, зялёныя, ласкавыя.



**49.** Прачытайце скорагаворку, правільна вымавіце гук [ч]. Спішыце.

Сінія званочкі раскрылі свае вочкі.

**50.** Прачытайце, дапаўняючы словы гукам [ч].

| | | |
|---|---|---|
| грыбо..кі | ка..ка | хлоп..ык |
| пянё..кі | ча..отка | мя..ык |
| бараві..кі | лісі..кі | зай..ык |

**51.** Разгледзьце малюнак. Прачытайце назву тэксту. Як вы думаеце, пра якую сустрэчу пойдзе ў ім размова? Паслухайце тэкст.

## Прыемная сустрэча

Юрачка з татам збіралі ў лесе грыбы. Хлопчык абыходзіў кожнае дрэва, заглядваў пад кожны куст. Пад старой елкай ён убачыў нешта дзіўнае.



Правообладатель Национальный Институт образования

Некалькі сухіх лісткоў рухаліся яму насустрач, як жывыя. Юра спачатку здзівіўся, а потым заўважыў пад лісткамі вожыка.



Хлопчык захацеў пачаставаць звярка. Ён працягнуў яму спачатку баравічок, а потым сухі лісток. Аднак вожык згарнуўся ў клубочак.

Падышоў тата. Ён расказаў сыну, што вожыкі ядуць насякомых і слімакоў. Сухія лісткі дрэў, якія накалоліся на іголкі, яны пераносяць у сваё гняздо.

Дзе Юрачка сустрэў вожыка? Чаму хлопчык не адразу заўважыў пад елкай звярка? Чаму вожык не еў пачастункі, якія прапанаваў яму Юрачка?

Падбярыце з тэксту сказы да малюнка.

Знайдзіце і прачытайце словы, у якіх вымаўляецца гук [ч].



Правообладатель Национальный Институт образования

Рм Прачытайце тэкст. Вусна перакажыце яго па пытаннях. Выкарыстайце словы ў дужках.

1. Што рабілі ў лесе Юрачка з татам? *(Грыбы, хлопчык, заглядваў, убачыў.)*

2. Што здзівіла хлопчыка? *(Некалькі, рухаліся, насустрач, здзівіўся, заўважыў, вожыка.)*

3. Чым Юра захацеў пачаставаць вожыка? *(Баравічком, сухім лістком.)*

4. Што расказаў тата хлопчыку? *(Ядуць насякомых, слімакоў, сухія лісткі, у гняздо.)*

**52.** Паслухайце скорагаворку. Назвы якіх птушак сустрэліся ў ёй? Якая птушка і які танец маюць аднолькавую назву?



## Чачотка

Скача чапля на балоце,
чачотачка — у чароце,
а чубаты чачот
топча, топча агарод.

*Васіль Вітка.*



Правообладатель Национальный Институт образования

Назавіце словы з гукамі [ч], [г]. У якіх словах вымаўляюцца два гукі [ч]. Навучыцеся правільна чытаць скорагаворку.

Запішыце пад дыктоўку назвы птушак.

**53.** Дапоўніце сказы патрэбнымі словамі. Назавіце словы з гукам [ч].


... — гэта птушка.


... — гэта расліна.


... — гэта абутак.


... — гэта цацка.

Запішыце два сказы на выбар.



**54.** Прачытайце пытанне. Выберыце ў дужках адказ на яго.

**Якія грыбочкі растуць на пянёчках?** *(Апенькі, баравічкі, лісічкі.)*

Запішыце пытанне і слова-адказ. Падкрэсліце словы з гукам [ч].



Правообладатель Национальный Институт образования

**55.** Разгледзьце малюнкі. Назавіце прадметы па-руску. Прачытайце беларускія словы.



*шчыпцы*



*шчотка*



*шчыт*

Якімі гукамі адрозніваецца вымаўленне рускіх і беларускіх слоў?

**Гаварыце правільна**

**[шч] — [шч]а́ўе, [шч]упа́к, бор[шч].**

**56.** Прачытайце словы. Выразна вымавіце спалучэнне гукаў [шч].

| | | |
|---|---|---|
| шчаня | шчыгол | лешч |
| шчаняты | шчыгляня | плашч |
| шчака | шчасце | боршч |
| шчочка | шчодры | хрушч |

Назавіце словы, якія заканчваюцца спалучэннем гукаў [шч].



Правообладатель Национальный Институт образования

**57.** Прачытайце тэкст пра сабачку Барсіка.



Барсік ні на каго не падобны. Ён ке́млівы, усё разумее.

Аднойчы дапамог малому шчанючку́, якога суседзі прывязалі на вяроўку. Шчанюк скуголіў, плакаў. Барсік слухаў яго плач, слухаў і вырашыў дапамагчы.



Ён перагрыз вяроўку і прывёў шчанюка ў сваю будку.



Падбярыце з тэксту сказы да кожнага малюнка. Назавіце словы з гукамі [ч], [шч].

**58.** Прачытайце скорагаворкі. Правільна вымавіце гукі [ч], [г] і спалучэнне [шч].

Шчоткай чышчу шчанят.

Шчыгол са шчыгліхай кармілі шчыглянят.

Запішыце першы сказ.



Правообладатель Национальный Институт образования

**59.** Да назваў жывёл падбярыце назвы іх дзіцянят.

У качкі … .



*шчаняты*

У курыцы … .



*качаняты*

У сабакі … .



*кураняты*

Запішыце сказ са словам *шчаняты*.

**60.** Разгледзьце малюнкі. Знайдзіце адпаведныя словы ў пірамідзе.



*рыба*



*дзіцяня сабакі*

| | | | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|---|---|
| | | | **ш** | **ч** | | | |
| | л | е | **ш** | **ч** | ы | т | |
| п | л | а | **ш** | **ч** | а | к | а |
| б | о | р | **ш** | **ч** | а | н | я |



*частка твару чалавека*

*адзенне*





*зброя*



*ежа*

Запішыце словы пад дыктоўку.



Правообладатель Национальный Институт образования



**61.** Прачытайце. Выберыце патрэбныя словы.



Шчупак — *(рыба, птушка)*,
а шчыгол *(рыба, птушка)*.



Запішыце сказ, які атрымаўся.

## Гук [ў] і яго абазначэнне на пісьме



**62.** Разгледзьце малюнкі. Скажыце, хто на іх намаляваны. Прачытайце беларускія словы.



*воўк*



*леў*



*жураўлі*

Якім гукам адрозніваецца вымаўленне беларускіх слоў ад рускіх? Якой літарай абазначаецца гэты гук?

**Завяжы вузялок!**

Гук [ў] абазначаецца літарай ***ў*** (***у*** нескладовае).



Правообладатель Национальный Институт образования

**63.** Напішыце ў сшытку літары, спалучэнні літар, словы.

*ў ў ў аў оў уў еў іў*

*леў лаўка воўк праўда*

**64.** Прачытайце словы. Выразна вымавіце гук [ў].

| | | |
|---|---|---|
| быў | прыйшоў | салаўі |
| жыў | згубіў | аўсянкі |
| шыў | шукаў | жаўрукі |
| ішоў | знайшоў | жураўлі |

Перачытайце словы апошняга слупка. Змяніце кожнае з іх так, каб яно называла адну птушку.

**65.** Разгледзьце малюнак і прачытайце назву тэксту. Як вы думаеце, пра што пойдзе ў ім размова? Паслухайце тэкст.

## Рукавіца

Андрэйка гуляў у парку і згубіў рукавіцу. Шукаў і не знайшоў.

Праз месяц ён зноў прыйшоў у парк. Прыйшоў і ўбачыў на дрэве сваю рукавіцу.



Правообладатель Национальный Институт образования



Яна вісела на суку. Андрэйка падышоў і працягнуў да рукавіцы руку. А з яе вылецела птушка. Хлопчык заглянуў у рукавіцу. Ён убачыў там гняздо і чатыры яечкі. Андрэйка здзівіўся. Ён ніколі не чуў, каб птушкі гнёзды вілі ў рукавіцах.

Побач на галінцы скакалі два верабейкі. Гэта яны занялі рукавіцу Андрэйкі. *(Паводле В. Хомчанкі.)*

Хто галоўны герой апавядання? Што згубіў Андрэйка ў парку? Хто заняў яго рукавіцу? Што было ў рукавіцы?

Прачытайце тэкст. Знайдзіце ў тэксце сказы, якімі можна падпісаць малюнак. Назавіце ў іх словы з гукам [ў].

**66.** Прачытайце прыказку. Як сябе адчувае чалавек далёка ад Радзімы? Як пра гэта сказана ў прыказцы?

Чалавеку без Радзімы, што салаўю без песні.

Назавіце слова з гукам [ў].



Правообладатель Национальный Институт образования



**67.** Прачытайце скорагаворкі і навучыцеся правільна вымаўляць іх.

**Жораў у небе, у полі жаўрук.**
**У Паўліка і Ігната гусянят багата.**

Выпішыце словы з літарай ***ў***.

**68.** Прачытайце, дапаўняючы словы гукам [ў].

| | | |
|---|---|---|
| ішо.. | разгубі..ся | зірну.. |
| крочы.. | здзіві..ся | убачы.. |
| хаце.. | дакрану..ся | гляну.. |
| бы.. | сабра.. | схава.. |

**69.** Паслухайце тэкст.

## Цёплы грыб



Ішоў па лесе Паўлік і ўбачыў стары́ баравік. Хацеў збіць яго нагой. Раптам з-пад грыба выбегла мале́нькая мышка. Паўлік зірнуў пад шапку баравіка і здзівіўся. Каго там толькі не было: і матылёк, і страказа, і конік,



Правообладатель Национальный Институт образования

і жучкі! Нават жабка была. Як у тым церамку.

Паўлік дакрануўся пальцам да грыба, а ён — цёплы. Дзень жа быў халодны. Дожджык з самай раніцы ішоў. Вось грыб і сабраў пад сваю шапку жыхароў лесу. І прыгрэў, і ад дажджу схаваў.



***ко́нік*** — рус. *кузне́чик*

Каго ўбачыў пад грыбам Паўлік? Чаму лясныя жыхары хаваліся пад грыбам?

Прачытайце тэкст. Назавіце словы з гукам [ў].

Якую яшчэ назву можна даць тэксту?

**70.** Прачытайце. Правільна вымавіце гукі [ч], [г], [ў].




**Смоўж**

Раіць пчолка смаўжу:
— Уцякай ад дажджу,
ад дажджу і грому
ўцякай дадому.



Правообладатель Национальный Институт образования

Смоўж смяецца:
— Дом жа свой
я заўжды нашу з сабой.
*Хв. Жычка.*

Які дом мае смоўж?



Як па-іншаму называецца смоўж? Якія яшчэ жывёлы маюць ракавіну?

**71.** Прачытайце верш. Назавіце словы, у якіх ёсць гук [ў].

Гэй, мураш, спявай гучней!
Запрашай сваіх гасцей!
Матылькоў і павучкоў,
вусеняў і чарвячкоў.
*Т. Мушынская.*



***ву́сень*** — лічынка матыля,
рус. *гу́сеница*

Дапоўніце і запішыце сказ. Падкрэсліце ў словах літару ***ў***.

Мураш запрасіў ... і ..., ... і ... .



Правообладатель Национальный Институт образования

**72.** Адгадайце загадку.



Маша
кашу спажывае,
ціха птушачка
спявае.




Што за птушка,
што за каша —
слова гэтае
падкажа.

*У. Мазго.*

Запішыце слова-адгадку, падкрэсліце літару **ў**.

Якая аўсянка можа быць смачнай, а якая — маленькай?



**73.** Прачытайце верш. Які ён: сур’ёзны ці жартоўны? Дзе жыве ўдод?

Устаў удод ура́нні,
прыбраў сваё дупло,
і твар памыў у ванне,
і кожнае крыло.

*С. Сокалаў-Воюш.*

Назавіце словы з гукам [ў].



Правообладатель Национальный Институт образования

# Гук [ц’], літары *Ц, ц*

*Ц ц*

**74.** Разгледзьце малюнак. Вымавіце сказы па-руску і па-беларуску ўслед за настаўнікам.



— *Тихо, Тимоша!* — *Ціха, Цімоша!*

Прачытайце сказ, запісаны па-беларуску. Як абазначаецца гук [ц’] на пісьме?

**Завяжы вузялок!**

У беларускай мове ёсць мяккі гук [ц’]. На пісьме ён абазначаецца літарай ***ц***.

**75.** Запішыце спалучэнні літар, словы.

*це ця цё цю ці цень*

*Ц Цішан ціха цётачка*



Правообладатель Национальный Институт образования

**76.** Прачытайце словы. Які гук абазначаюць выдзеленыя літары?

| | | |
|---|---|---|
| бра**ц**ік | сядзі**ць** | снеда**ць** |
| дзе**ц**і | крычы**ць** | абеда**ць** |
| **ц**ягнік | абу**ць** | вячэра**ць** |
| самалё**ц**ік | верталё**ц**ік | салда**ц**ік |

Прачытайце словы трэцяга слупка.

Якое з іх лішняе? Чаму? Калі людзі снедаюць? Абедаюць? Вячэраюць?

**77.** Прачытайце верш. Правільна вымавіце гукі [ц’], [ў].

## Сараканожкі

Да зары ўстаюць сараканожкі,
каб паспець абуць у боты ножкі.
Ды пакуль абуюць сорак ножак,
ноч настане — і пара́ ў ложак.

*У. Мацвеенка.*

Хто такія сараканожкі? Што выклікала ў вас усмешку?

Выпішыце словы, у якіх вымаўляецца гук [ц’].



Правообладатель Национальный Институт образования

**78.** Паслухайце тэкст.

## Чаго крычыце́?



У нядзелю ўсе дома. Паселі абедаць. Тата і дзеці — усе вакол стала. А мама заканчвае завіхацца ля пліты і паведамляе, што засмажыла курыцу з салодкай моркаўкай. Чуваць прыемны пах і шыпенне.

— Мне ножку! — закрычала Юля.

— І мне ножку, — крычыць Галя.

— І мне! Мне мама заўсёды дае ножку! — крычыць Толя.

Дзяніс, самы малодшы, сядзіць спакойна і разважае, як дарослы:

— Ну чаго вы крычыце́? Хіба ж курыца саракаsuccessножка? *(І. Грамовіч.)*

Дзе сабралася ў нядзелю сям'я? Назавіце ўсіх членаў сям'і, якія сабраліся за сталом. Чаго хацелі старэйшыя дзеці, аб чым яны крычалі? Чаму словы малодшага брата выклікалі ў вас усмешку?

Прачытайце размову дзяцей.



Правообладатель Национальный Институт образования

**79.** Прачытайце. Дапоўніце сказы патрэбнымі словамі. Назавіце ў сказах словы з гукам [ц’].

Сястрычка і брацік прачнуліся і селі … .

Днём мы ходзім у школьную сталовую … .

Увечары мама паклікала ўсіх … .

вячэраць

снедаць

абедаць

**80.** Прачытайце словы ў красвордзе. Знайдзіце адпаведныя малюнкі.




Выпішыце словы, якія пачынаюцца з гука [ц’].



Правообладатель Национальный Институт образования



**81.** Адгадайце загадку. Выпішыце з яе словы, у якіх вымаўляецца гук [ц’].



Я люблю, шкадую іх,
добрых брацікаў маіх.
Злева пяць і справа пяць.
Адгадайце, як іх зваць.

*В. Кудлачоў.*

**82.** Прачытайце, дапаўняючы словы гукам [ц’].

| | | |
|---|---|---|
| ліс..е | адля..елі | па..яплела |
| ве..ер | засвя..іла | заха..елі |

**83.** Паслухайце верш. Пра якія прыкметы надыходу восені гаворыцца ў ім?

## Лета не дагнаць

Адпала́лі
васількі.
Адляцелі
матылькі.
Неяк
вельмі непрыкметна
адышло з цяплом
і лета.

*У. Карызна.*

Прачытайце верш. Назавіце словы, у якіх ёсць гук [ц’].



Правообладатель Национальный Институт образования

**84.** Прачытайце тэкст. Які букет сабралі Насця і Віця? Каму дзеці вырашылі яго падарыць?

## Восень у букеце

Тата і дзеці гулялі ў асеннім парку. Свяціла сонейка. Вецер зрываў з дрэў стракатае лісце.

Дачушка Насця пачала збіраць каляровыя лісцікі ў букет. Сын Пеця дапоўніў яго чырвонай гронкай рабіны.

— Тата, паглядзі! Восень у букеце! — усклікнула Насця.



— Якая прыгажосць! — сказаў тата. — Каму мы яе падорым?

— Маме! — радасна закрычалі дзеці.



***гро́нка*** — шмат пладоў або кветак на адной галінцы

Назавіце словы з гукам [ц’].

Прачытайце па ролях размову таты і дзяцей.



Правообладатель Национальный Институт образования

**85.** Прачытайце. Назавіце адным словам.

Тата, мама, бабуля, дзядуля, цётка, брацік, сястра, прабабка, прадзед.

Вымавіце словы з гукам [ц’] і запішыце.

**Рм** Назавіце членаў вашай сям’і. Як іх завуць? У якіх імёнах вашых сваякоў ёсць гук [ц’]?

**86.** Разгледзьце малюнак. Як завуць дзяўчынку? Якія сваякі ёсць у яе? Як іх завуць?




Дапоўніце спалучэнні слоў патрэбнымі імёнамі сваякоў.

Мама ..., тата ..., брацік ... .

Запішыце. Падкрэсліце літару ***ц***.



Правообладатель Национальный Институт образования

**87.** Прачытайце прыказкі. Як адчуваюць сябе дзеці побач з мамай?

Няма лепшага сябра, чым родная маці.
Пры сонейку цёпла, пры матулі добра.

Назавіце словы з гукам [ц’]. Спішыце другую прыказку.

**Рм** Якімі ласкавымі словамі вы называеце сваю маці? Як яна пяшчотна называе вас?



**88.** Прачытайце верш. Назавіце словы з гукам [ц’].

У сям’і расце сынок,
вельмі мілы пестуно́к.
Мама гляне... Ох, дакор!
Бо капрызіць наш Ягор!

*Т. Мушынская.*



***пясту́н*** — *балаўні́к*
***дако́р*** — незадавальне́нне, рус. *упрёк*

Спішыце першы сказ. Падкрэсліце літары ***і***, ***ц***, слова з апострафам.



Правообладатель Национальный Институт образования

## Гук [р], літары *Р, р*

*Р р*

**89.** Разгледзьце малюнкі. Скажыце па-руску, што на іх намалявана. Прачытайце беларускія словы.



*рэпа*



*рабіна*



*грэчка*

Якімі гукамі адрозніваецца вымаўленне рускіх і беларускіх слоў?

**Завяжы вузялок!**

У беларускай мове гук [р] вымаўляецца толькі цвёрда: ***рыс, кручок, рэбус.***

**90.** Запішыце літары, спалучэнні літар, словы.

*ра ру кручок рэпа рабіна*

*Р Р Рыта Рома Рэчыца*



Правообладатель Национальный Институт образования

**91.** Прачытайце. Правільна вымавіце гук [р].

Ма**р**ына ма**р**ынавала мо**р**каўку. *(Н. Несцяронак.)*

**92.** Прачытайце словы. Выразна вымавіце гук [р].

| | | |
|---|---|---|
| праца | абрус | гаспадар |
| работа | кватэра | гаспадарыць |
| добра | дружна | гаспадарка |

Назавіце слова, якое пачынаецца з гука [р].

**93.** Паслухайце тэкст.

## Не хапіла работы

Перад адыходам на работу маці паклікала Лізу і Таню і сказала:

— Прыбярыце, дачушкі, са стала, памыйце талеркі і лыжкі, падмяціце падлогу на кухні.

— Добра, мамачка. Усё зробім, — дружна адказалі дзяўчынкі.

Увечары вярнулася маці дадому, бачыць: стол засланы чыстым абру́сам, посуд вымыты, кухня падмецена.



Правообладатель Национальный Институт образования



— Малайчыны, дзеткі, — пахваліла маці дзяўчынак. — Хто з вас са стала прыбраў і заслаў яго абрусам?

— Я, — адказала Таня.

— А хто талеркі і лыжкі памыў?

— Я, — зноў адазвалася Таня.

— А ты, Ліза, што рабіла? — глянула маці на старэйшую дачку.

— Я... я нічога, мама, не рабіла. Таня ўсё забрала сабе. Мне не хапіла работы, — апусціла галаву дзяўчынка. *(Паводле Н. Парукава.)*



***абру́с*** — рус. *ска́терть*

Аб чым папрасіла маці дачушак?

Хто зрабіў усю работу па доме? Чаму Лізе не хапіла работы? Чаму дзяўчынка вінавата апусціла галаву? Як вы думаеце, ці засталася задаволена мама? Чаму?

Прачытайце размову, якая адбылася ў мамы з дзецьмі ўвечары. Назавіце словы з гукам [р].



Правообладатель Национальный Институт образования

**94.** Прачытайце. Выпішыце словы з гукам [р]. Падкрэсліце літары, якія пішуцца пасля ***р***.

Рыта і Рома — маміны памочнікі. Яны мыюць падлогу, прыбіраюць у кватэры, ходзяць у магазін.

***кватэ́ра***



**95.** Прачытайце скорагаворку і навучыцеся правільна вымаўляць яе.

Ларыса варыла рыбу з лаўровым лістом.

Спішыце, назавіце словы з гукам [р].

**96.** Прачытайце, дапаўняючы словы гукам [р].

| | | |
|---|---|---|
| д..овы | го..ка | п..асаваць |
| г..аблі | хо..аша | п..ацаваць |
| ага..од | пак..ывала | майст..аваць |
| Рыго.. | бела..усы | ст..ава |



***прасава́ць*** — *гла́дзіць пра́сам,*
рус. *гла́дить утюго́м*

Назавіце словы, якія адрозніваюцца адным гукам.



Правообладатель Национальный Институт образования

**97.** Паслухайце верш. Чаму ў агародзе ўсё расце?

## Дружная сямейка



Працуе дружная сямейка:
рыдлёўка,
граблі,
лейка.
Жывуць здавён у добрай згодзе,
працуюць шчыра ўсе гады,
і ў доме іх —
у агародзе —
зялёна, хараша заўжды.

*М. Чарняўскі.*



***жыву́ць у зго́дзе*** — *ма́юць мі́рныя, сябро́ўскія адно́сіны*
***здавён*** — *з да́ўніх пор*

Прачытайце верш. Назавіце словы з гукам [р]. Спішыце першы сказ. Падкрэсліце назвы садовых інструментаў, у якіх вымаўляецца гук [р].

**Рм** Як па-іншаму называецца рыдлёўка?



Правообладатель Национальный Институт образования

**98.** Прачытайце, правільна вымавіце гук [р]. Адгадайце загадку.



**П**араход на мяккім моры
**Р**азраўняў адразу хвалі,
**А**ддае ён гальштук Рому, і —
**С**укеначку для Валі.

*У. Мацвеенка.*

Запішыце слова-адгадку. Назавіце па парадку гукі ў гэтым слове.

Рм **99.** Раскажыце, як вы дапамагаеце сваякам. Карыстайцеся словамі ў дужках.

Я дапамагаю — маме / бабулі

(мыць талеркі, прыбіраць кватэру, прасаваць сукенку, штаны)

Разам — з татам / з дзядулем — мы

(прыбіраем кватэру, мыем посуд, майструем розныя рэчы)

Назавіце словы з гукам [р].



Правообладатель Национальный Институт образования

**100.** Прачытайце скорагаворку. Правільна вымавіце гукі [р], [г].

## Руплівы Рыгорка

Дровы складвае Рыгорка —
і расце з паленцаў горка.

*Л. Чайко.*



***руплівы** — старанны*

**101.** Спішыце. Падкрэсліце словы, у якіх вымаўляецца гук [р].

Дранікі — вядомая страва беларускай кухні.



Назавіце вядомыя вам стравы беларускай кухні. Пры неабходнасці даведайцеся пра іх у старэйшых.



**102.** Прачытайце і адгадайце загадку. Назавіце ў ёй словы з гукам [р].

Быццам белы снег на дол,
пакрывалам лёг на стол.
Рады госцю беларус,
засціла́ючы ... .

*У. Мазго.*





Правообладатель Национальный Институт образования

# Гук [дз’] і яго абазначэнне на пісьме

Дз дз

**103.** Разгледзьце малюнак. Прачытайце сказы.



Звініць званок. Дзеці вітаюць настаўніцу.

Пры дапамозе гука [дз’] пакажыце, як звініць званок.

**Завяжы вузялок!**

У беларускай мове гук [дз’] абазначаецца дзвюма літарамі ***д*** і ***з***.

**104.** Запішыце спалучэнні літар, словы.

дз дзі дзя дзю дзё

дзеці людзі Дз Дзіма



Правообладатель Национальный Институт образования

**105.** Прачытайце словы. Які гук абазначаюць выдзеленыя літары?

| | | |
|---|---|---|
| дзень | дзякуй | людзі |
| дзянькі | падзяка | дзеці |
| Дзіма | Дзіна | Дзяніс |

Запішыце слова, якім мы выказваем падзяку іншым людзям.

**106.** Паслухайце верш.

## Як калі вітацца

Добра вывучыла Ганка,
як заўжды вітаць людзей:
«Добрай раніцы!» — уранку,
ну, а «Добры дзень!» — удзень.
Прыйдзе вечар — «Добры вечар!»
і «Дабранач!» — перад тым,
як у цёплы ложак легчы
і да ранку спаць у ім.

*А. Зэкаў.*

Якімі словамі трэба вітаць людзей? Што трэба гаварыць перад сном?

Прачытайце верш. Правільна вымавіце словы з гукам [дз’].



Правообладатель Национальный Институт образования

**107.** Прачытайце прыказку. Які настрой ствараюць у людзей ветлівыя словы?

Ласкавае слова — што дзень ясны.

Вымавіце слова з гукам [дз']. Назавіце па парадку гукі ў гэтым слове. Спішыце прыказку.



**108.** Прачытайце.

Добры дзень, лужок квяцісты, гаманлівы, галасісты! *(Н. Галіноўская.)*

Спішыце. Падкрэсліце слова, у якім вымаўляецца гук [дз'].

**109.** Прачытайце словы. Які гук абазначаюць выдзеленыя літары?

| | | |
|---|---|---|
| адзін | абходзіць | Надзя |
| гадзі́на | выходзіць | Уладзік |
| гадзіннік | прыходзіць | Федзя |
| ідзе | дзевяць | дзесяць |

Якія словы пачынаюцца з гука [дз']?



Правообладатель Национальный Институт образования

**110.** Прачытайце скорагаворку. Якое слова ветлівасці сустрэлася ў ёй? Які асаблівы гук беларускай мовы ёсць у ім?



Авечкі чарнявыя,
авечкі бялявыя,
дзякуй вам за спаднічкі,
дзякуй за рукавічкі.
*Н. Галіноўская.*

**Рм** Уявіце, што ў вас перастала пісаць ручка або затупіўся аловак. Да каго вы можаце звярнуцца па дапамогу? Якія словы трэба выкарыстаць, каб вам не адмовілі ў просьбе? Разыграйце размову з суседам па парце.

**111.** Прачытайце верш. Чаму школьны званок параўноўваецца з жаўруком?

За парты зноў паклікаў нас
званок — жаўрук вясёлы.
Дзень добры, родны светлы клас!
Дзень добры, школа!
*Л. Чыркунова.*



Правообладатель Национальный Институт образования

Назавіце словы ветлівасці, якія сустрэліся ў вершы. Запішыце сказы з імі.

**Рм** Назавіце па-беларуску асеннія месяцы. У які месяц восені пачынаецца навучальны год?

**112.** Дапоўніце сказы патрэбнымі словамі.



1. Стаіць сонечны асенні ... .
2. ... ідуць у школу.
3. Іх сустракае настаўніца ... .
4. Яна вітае іх: «Дзеці, ... ... !»

Словы для даведкі: *дзеці, дзень, добры дзень, Надзея Дзмітрыеўна.*

Назавіце ў сказах словы з гукам [дз’].

Запішыце два сказы на выбар. Падкрэсліце словы, у якіх вымаўляецца гук [дз’].

**Рм** Назавіце тых вучняў свайго класа, у імёнах якіх ёсць гук [дз’].



Правообладатель Национальный Институт образования

**113.** Палічыце ад 1 да 10. У назвах якіх лікаў ёсць гук [дз’]?

**Рм** У колькі гадзін пачынаюцца заняткі ў школе?



**114.** Навучыцеся правільна вымаўляць скорагаворку. Назавіце словы з гукам [дз’].

Дзьмухнула на дзьмухавец Ларыса —
і адразу дзьмухавец стаў лысы.

*А. Зэкаў.*

## Гук [дж] і яго абазначэнне на пісьме

*Дж дж*

**115.** Разгледзьце малюнак.



Паспрабуйце пры дапамозе гука [дж] паказаць, як гудзе жук.

**Завяжы вузялок!**

У беларускай мове гук [дж] абазначаецца дзвюма літарамі ***д*** і ***ж***.



Правообладатель Национальный Институт образования

**116.** Запішыце спалучэнні літар, словы.

*Дж джа джэ джо*

*джу джы джала хаджу*

**117.** Прачытайце словы. Правільна вымавіце гук [дж].

| | | |
|---|---|---|
| дажджы | дажджлівы | джала |
| дожджык | ураджай | джа́ліць |
| дажджынка | ураджайны | джэм |

Назавіце літары, якімі абазначаецца гук [дж].

**Гаварыце правільна**

*даж*[***дж***]*ы* — *до*[***шч***].

**118.** Прачытайце. Запомніце і праверце народныя прыкметы.

Ластаўкі нізка лётаюць — будзе дождж.

Многа рабіны — восень дажджлівая, мала — сухая.

***дождж***

Спішыце адзін сказ на выбар. Падкрэсліце спалучэнне літар ***дж***.



Правообладатель Национальный Институт образования

**119.** Прачытайце часткі тэксту. Пастаўце іх у патрэбнай паслядоўнасці.



Бабуля не пусціла хлопчыкаў у лес.

— Ластаўкі нізка лётаюць — хутка будзе дожджык, — сказала яна.

Быў сонечны дзень. Дзед з Міхаськам перабіралі вýды, калі прыбег Федзя. Ён паклікаў Міхаську па грыбы.





А дзядуля падвёў хлопчыкаў да акварыума.

— Калі рыбкі па паверхні вады плаваюць, будзе дожджык, — сказаў ён. — Прырода — жывы барометр.



Правообладатель Национальный Институт образования



***баро́метр*** — тут: *паказчык змен надвор’я*

Пра якія народныя прыкметы вы прачыталі? Знайдзіце ў тэксце словы з гукамі [дз’], [дж].

**120.** Прачытайце верш. Знайдзіце і прачытайце словы, у якіх вымаўляюцца гукі [дз’], [дж], [р], [ц’], [ў].

Божая кароўка,
што заўтра будзе —
дожджык ці пагода?
Пень ці калода?
Пагода — ляці.
Дожджык — сядзі!

Выпішыце словы з гукамі [дз’], [дж].



**121.** Прачытайце. Спішыце адзін сказ на выбар. Падкрэсліце літары, якія абазначаюць гукі [дз’], [дж].

Без дажджу і трава не расце.
У маі дажджы — будзе ўраджай.



Правообладатель Национальный Институт образования

## Адкажыце на пытанні

**1.** Вымавіце гукі: [дз’], [л], [дж], [м], [ў]. Якіх гукаў няма ў рускай мове?

**2.** Напісанне якой літары адрозніваецца ў рускай і беларускай мовах?

**3.** Якой літары няма ў рускай мове?

**4.** Што такое апостраф?

**5.** Якія гукі ў беларускай мове абазначаюцца дзвюма літарамі?

*Пры адказе на якія пытанні ўзніклі цяжкасці? На якіх старонках вучэбнага дапаможніка можна знайсці адказ на гэтыя пытанні?*

Правообладатель Национальный Институт образования

# ГУКІ І ЛІТАРЫ

## Гукі мовы

| па-беларуску | па-руску |
| --- | --- |
| гук | звук |

**Успомніце з урокаў рускай мовы**

З чаго складаюцца словы?

**122.** Вымавіце словы. Назавіце па парадку гукі ў кожным з іх.

Дзяцел, воўк, пчала, джала, ластаўка, шчупак.

Назавіце тыя гукі ў словах, якіх няма ў рускай мове. У якім слове сустрэліся два «асаблівыя» гукі беларускай мовы?

Словы складаюцца з гукаў мовы.
Гукі мы чуем і вымаўляем.



Правообладатель Национальный Институт образования

**123.** Прачытайце скорагаворкі. Вымавіце словы, якія адрозніваюцца адным гукам. Выпішыце іх.

Сава́ саву́ спалохала ў соснах.
Соні сняцца суніцы, Тоні сняцца куніцы.

***суні́цы*** — рус. *земляні́ка*

**124.** Замяніце адзін гук у словах. Назавіце новыя словы.

зайка — [м] [ч] [л]

каза — [с] [р]

бык — [у] [а] ?

дом — ? ?

**125.** Да прапанаваных слоў падбярыце словы, якія адрозніваюцца адным гукам.

жук — …
вожык — …
сом — …
бычок — …
кошка — …
мошка — …

Запішыце пары слоў.

Узор: *леў* — *лес*.



Правообладатель Национальный Институт образования

**126.** Прачытайце верш. Калі ў бары паспяваюць чарніцы? Як яны малююць губкі?

## Чарніцы



Абвяшчае бор, бор
на паляне збор, збор.
Чорныя чарніцы,
нібы чараўніцы,
сыплюцца ў кубкі
ды малююць губкі.

*Д. Бічэль.*

Назавіце словы, якія адрозніваюцца адным гукам.

**Рм** Хто з вас збіраў чарніцы? Як гэта трэба правільна рабіць? Чым карысныя чарніцы?



**127.** Якія словы можна скласці з гукаў [с], [н], [о]? Дапоўніце сказ патрэбным словам.

Спіць спакойна стары сом, бачыць ён салодкі … . *(С. Касенка.)*

Запішыце сказ.



Правообладатель Национальный Институт образования

## Абазначэнне гукаў на пісьме літарамі

| **па-беларуску** | **па-руску** |
|---|---|
| літара | буква |

**Успомніце з урокаў рускай мовы**

Для чаго неабходны літары?

**128.** Разгледзьце малюнкі. Што на іх адлюстравана?



*с, н, о, ц, а*



*в, с, я, л, к, ё, а*



*а, х, м, р, а*



*з, р, о, к, а*

З літар пад малюнкамі складзіце і запішыце словы.

> Гукі на пісьме абазначаюцца літарамі.

**Успомніце**

Якімі літарамі абазначаюцца гукі [дз’], [дж], [ў]?



Правообладатель Национальный Институт образования

**129.** Прачытайце. Пра якую пару года гаворыцца ў тэксце?

Верасень — першы месяц восені. У верасні зацвітаюць верасы. У кастрычніку шмат пахму́рных **дзён**. У **лістападзе** часта ідуць **дажджы**.

Вымавіце па парадку гукі і назавіце літары ў выдзеленых словах. Спішыце першы і чацвёрты сказы.

*ме́сяц*

**130.** Прачытайце. Чым асенні лісток падобны на птушанятка? Што аўтар называе *жоўтым статкам*?

### Лістапад



Як малое птушанятка,
перабег лісток дарожку.
**Кінуўся** за **жоўтым** статкам,
мільганулі **толькі** ножкі.

*Васіль Вітка.*

*ста́так* — рус. *ста́до*

Вымавіце па парадку гукі, назавіце літары ў выдзеленых словах.

Запішыце словы з літарай ***ў***.



Правообладатель Национальный Институт образования

## Успомніце з урокаў рускай мовы

Ці абазначае гук літара **ь**?

**131.** Прачытайце прыказкі. Чым адметная восень?

1. Увосень работ восем. 2. Багата вясна кветкамі, а восень пале́ткамі.



***пале́так*** — *по́ле*

Выпішыце словы, у якіх літар больш, чым гукаў.

Назавіце словы, якія адрозніваюцца адным гукам. Якімі літарамі яны адрозніваюцца?



Гульня «Абракадабра».





**132.** Прачытайце. Вымавіце па парадку гукі, назавіце літары ў выдзеленых словах.

**Паўлік** любіць восень. Але **толькі** тыя дні, калі няма **дажджу**.

Спішыце. Падкрэсліце літару, якая не абазначае гука.



Правообладатель Национальный Институт образования

## Беларускі алфаві́т

**133.** Прачытайце назвы літар беларускага алфавіта на форзацы вучэбнага дапаможніка. Палічыце колькасць літар.

Назавіце літару, якой няма ў рускім алфавіце. Якія літары па-рознаму называюцца ў рускай і беларускай мовах?

Назавіце «суседзяў» літары ў алфавіце.

| | | | | | | | | | | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| ? | б | ? | ? | і | ? | ? | о | ? | ? | ц | ? | ? | ы | ? |

Разгледзьце малюнкі. Для чаго чалавеку трэба добра ведаць алфавіт?




Знайдзіце ў арфаграфічным слоўніку словы *дождж, месяц, кватэра*.

### Гаварыце правільна

*У алфаві́тным парадку.*



Правообладатель Национальный Институт образования

**Завяжы вузялок!**

Напісанне слоўнікавых слоў можна праверыць па арфаграфічным слоўніку.

**134.** Пастаўце літары кожнага радка ў алфавітным парадку, назавіце дзве наступныя літары. Запішыце.

ё, е, з, ж, і, .., ..
х, ў, т, у, ф, .., ..
л, о, м, п, н, .., ..

**135.** Паслухайце верш. Чаму Ганулю можна назваць мамінай памочніцай?

## Маленькая памочніца

Хоць маленькая Ганулья,
а памочніца матулі.
Адпачне яна нямнога,
падмяце тады падлогу.
Зробіць школьныя заданні
без памылак, са стараннем.
Сшыткі, кніжкі, ручку, гумку
зложыць акуратна ў сумку.



Правообладатель Национальный Институт образования

Посуд вымые Гануля.
Задаволена матуля.

*А. Дзеружынскі.*

Прачытайце сказ, у якім сустракаюцца назвы школьных прылад. Выпішыце гэтыя назвы ў алфавітным парадку.

**136.** Дапоўніце сказ назвамі школьных прылад. Упішыце іх у алфавітным парадку.






*ручка*   *гумка*   *пэ́ндзлік*   *аловак*

У рукзаку ляжаць ..., ..., ..., ... .

*рукза́к*

Як яшчэ называецца сумка, з якой ходзяць у школу?



**137.** Складзіце слова — назву школьнай прылады з пяці літар.

Першая літара слова стаіць за О,
другая літара — перад Ё,



Правообладатель Национальный Институт образования

трэцяя — паміж М і О,
чацвёртая — першая літара алфавіта,
пятая — за К.

Дапоўніце гэтым словам сказ. Запішыце.

Ручкі, алоўкі, гумку і пэндзлік кладуць у … .

**138.** Расшыфруйце і запішыце словы. Лічба ў клетцы ўказвае на парадкавы нумар літары ў алфавіце.

| | | | | |
|---|---|---|---|---|
| 17 | 6 | н | 1 | 13 |

| | | | | |
|---|---|---|---|---|
| 17 | 1 | 17 | к | 1 |

| | | | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|---|---|
| 17 | 1 | р | т | ф | 6 | 13 | ь |

Знайдзіце запісаныя словы ў арфаграфічным слоўніку. Пастаўце лічбы ад 1 да 3 над словамі ў той паслядоўнасці, у якой яны размешчаны ў слоўніку.

**139.** Дапоўніце сказ слоўнікавым словам.

Маленькі … — гэта рукзачок.

Запішыце сказ пад дыктоўку настаўніка.



Правообладатель Национальный Институт образования

**140.** Прачытайце верш. Чаму ён мае такую назву?

### Ягадныя месяцы

Чэрвень спéліць
чорныя чарніцы.
Ліпень дорыць
зорныя маліны.
Жнівень запрашае
браць брусніцы,
верасень прыносіць
журавіны.

*М. Пазнякоў.*

Выпішыце з верша ў адзін слупок назвы месяцаў года ў алфавітным парадку.

Выпішыце ў другі слупок назвы ягад у алфавітным парадку.



Назвы якіх месяцаў года пачынаюцца з адной літары? У якой паслядоўнасці яны будуць размешчаны ў арфаграфічным слоўніку?

**141.** Назавіце тых вучняў класа, якія маюць аднолькавыя імёны. Вымавіце прозвішчы гэтых вучняў у алфавітным парадку.



Правообладатель Национальный Институт образования



**142.** Спішыце загадку. Расшыфруйце і запішыце слова-адгадку.

Палачкі чароўныя
пакідаюць след,
імі каляровы
мы ствараем свет.
*С. Валодзька.*

| | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|
| 1 | 13 | 16 | 22 | 12 | 10 |

## Напісанне вялікай літары ў словах

**143.** Прачытайце скорагаворкі. Навучыцеся правільна вымаўляць іх.

**Пракоп** і **Барыска** елі барбарыскі.

На прагулку ў парк прыйшлі **Патап** і **Карп**. *(М. Пазнякоў.)*

Чаму выдзеленыя словы напісаны з вялікай літары? Выпішыце імёны людзей.

З вялікай літары пішуцца:
імёны, імёны па бацьку, прозвішчы людзей;
клічкі жывёл.



Правообладатель Национальный Институт образования

**144.** Растлумачце, з якой літары трэба напісаць выдзеленыя словы.



Набеглі слязінкі
на вочкі **(Г/г)алінкі:**
у ліпкі маленькай
зламаны **(Г/г)алінкі.**



Сказала на лаўцы
бабуля **(М/м)аруся:**
— Я так ад хады,
мой унучак, **(М/м)аруся.**

*А. Нафрановіч.*



***мары́цца — стамля́цца***

Спішыце першы сказ.

**145.** Якое значэнне мае слова «прозвішча» ў рускай і беларускай мовах? Прачытайце на вокладцы сшытка свае прозвішча і імя, запісаныя па-беларуску. Запішыце іх ў сшытак.



Раскажыце пра значэнне свайго імя. Пры неабходнасці запытайцеся ў бацькоў або знайдзіце патрэбныя звесткі ў інтэрнэце.



Правообладатель Национальный Институт образования

**146.** Паслухайце жарт.

## Мятая дарога



Дзед едзе на машыне з маленькай унучкаю, якую жартам называе Дар'яй Юр'еўнай. З асфальтаванай дарогі звярнулі на палявую. Раптам машыну на калдобінах пачало падкідваць.

Даша здзіўлена паглядзела на дзеда.

— Ты што, Дар'я Юр'еўна? — пытае дзед.

— Чаму тут дарога такая мятая? *(П. Кавалёў.)*



***калдóбіна** — выбóіна, ямка на дарозе*

Што выклікала ў вас усмешку? Чаму Даша назвала палявую дарогу мятай?

Назавіце імя і імя па бацьку, якія сустрэліся ў смяшынцы. Як завуць бацьку Дашы? Як завуць вашых дзядулю і бабулю?

Прачытайце размову дзеда і ўнучкі.



Правообладатель Национальный Институт образования



**147.** Да назваў жывёл дапішыце клічкі.





*(М/м)урка*

*(З/з)орачка*





*(О/о)рлік*

*(Б/б)арбос*

Кошка ..., сабака ..., жарабя ..., карова ... .

**148.** Дапоўніце сказ. Запішыце.

Мая Радзіма называецца ... ... .



*Рэспу́бліка Белару́сь*

З якой літары пішуцца назвы краін?

З вялікай літары пішуцца:
назвы краін, гарадоў, вёсак, вуліц;
назвы мораў, рэк, азёр.



Правообладатель Национальный Институт образования

**149.** Прачытайце верш.

### Твая Беларусь




Мяжуе з Польшчай,
Украінай,
Расіяй, Латвіяй, Літвой.
Твой родны край,
твая Айчына —
жыццё тваё і гонар твой.
*Ю. Свірка.*

Выпішыце ў алфавітным парадку назвы краін, з якімі мяжуе Беларусь.

У з о р: Латвія, ..., ..., ..., ... .

**150.** Прачытайце. Растлумачце, якія літары трэба ўставіць у словы.

Мы жывём у (Р/р)эспубліцы (Б/б)еларусь. Горад (М/м)інск — сталіца нашай краіны. У (Б/б)еларусі многа прыгожых гарадоў. Горад (Г/г)родна ўпрыгожвае рака (Н/н)ёман. Горад (Б/б)рэст — рака (Б/б)уг.

Спішыце сказы з назвамі гарадоў.



Правообладатель Национальный Институт образования

**151.** Да слоў з левага слупка падбярыце словы з правага слупка.

| | |
|---|---|
| рака | Нарач |
| горад | Днепр |
| возера | Магілёў |

Запішыце пары слоў.

**Рм** Вусна адкажыце на пытанні.

У якім горадзе (вёсцы) ты жывеш?
На якой вуліцы ты жывеш?
Як называецца рака ці возера, якія ёсць у вашым горадзе (вёсцы)?



**152.** Навучыцеся правільна чытаць скорагаворку Эдзі Агняцвет. Растлумачце правапіс вялікай літары ў словах.

*Рагатун Рыгорка родам*
*з Рагачова горада.*
*Як захоча, зарагоча*
*рагатлівым рогатам.*

Спішыце скорагаворку.



Правообладатель Национальный Институт образования

**153.** Прачытайце. Растлумачце, з якой літары трэба напісаць выдзеленыя словы.

Я з сабачкам **(Ж/ж)учком** крочу борам, саснячком. *(А. Дзеружынскі.)*

Ты, кароўка **(П/п)адласка**, не бадайся, калі ласка. *(Д. Бічэль.)*

Ты, **(Д/д)ружок**, хоць смелы пёс, ды ў стажок не сунь свой нос! *(М. Мятліцкі.)*

Спішыце першы сказ.



Гульня «Расфарбуй малюнак».



**154.** Адгадайце назву ракі з трох літар.

Першая літара гэтага слова стаіць за Р,
другая — перад П,
трэцяя — паміж Ё і З.

Дапоўніце гэтым словам сказ.

Горад (Г/г)омель стаіць на рацэ … .

Растлумачце правапіс вялікай літары ў словах.



Прыдумайце падобную загадку. Загадайце яе аднакласнікам.



Правообладатель Национальный Институт образования

**155.** Прачытайце сказы. Растлумачце, якія літары трэба ўставіць у словы.

1. Сяргейка жыве ў горадзе **(Ч/ч)эрвені.** 2. Летнія канікулы пачынаюцца ў **(Ч/ч)эрвені.** 3. Кошка **(М/м)ушка** грэецца на сонейку. 4. Ёй на вушка села **(М/м)ушка.**

Запішыце сказы, у якіх выдзеленыя словы пішуцца з вялікай літары.

**156.** Разгадайце рэбусы. Запішыце словы. Растлумачце іх напісанне.

| | |
|---|---|
| ША / ТА | Я / ДЗЕ |



**157.** Спішыце. Устаўце патрэбныя літары ў словы.



Вось ідуць каровы з (П/п)ашы,
Малако нясуць для (П/п)ашы.
(П/п)аша будзе вечарком
Есці кашу з малаком.

*Г. Аўласенка.*



Правообладатель Национальный Институт образования

## Галосныя і зычныя гукі

| **па-беларуску** | **па-руску** |
|---|---|
| галосныя | гласные |
| зычныя | согласные |

**Успомніце з урокаў рускай мовы**

Як вымаўляюцца галосныя гукі, а як — зычныя?

**158.** Вымавіце гукі. Які гук лішні? Чаму?

[а], [о], [у], [к], [ы], [і], [э]

Галосных гукаў 6: [а], [о], [у], [ы], [і], [э]. Астатнія гукі зычныя.

**159.** Назавіце літары.

а, в, е, ё, ж, і, й, н, о, у, ў, ы, э, ю, я

Якія літары служаць для абазначэння галосных гукаў? Выпішыце іх.

**160.** Прачытайце подпісы пад малюнкамі. Назавіце адным словам.



Правообладатель Национальный Институт образования

   

*чарніцы* *суніцы* *маліны* *ажыны*

Назавіце галосныя гукі ў словах.
Запішыце словы пад дыктоўку настаўніка.

**161.** Прачытайце. Што азначае выраз *умець пастаяць за сябе*? Літары галосных ці зычных гукаў прапушчаны ў словах?

С..н..цы — самыя хітрыя ягадкі. Яны пад лісце хаваюцца.

М..л..н.. — цудоўныя ягадкі! І колерам, і смакам чаруюць.

Аж..н.. пастаяць за сябе ўмеюць. Галінкі іх шыпамі пакрыты.

Запішыце сказы, у якіх гаворыцца пра вашы любімыя ягады. Падкрэсліце літары, якія ўставілі.

Якое варэнне можна зварыць з гэтых ягад?



Правообладатель Национальный Институт образования



**162.** Прачытайце верш.



**На балоце** жураўлінам
мы шукаем **журавіны**.
Абаронцай стаць павінны
ад хваробаў — журавіны.
*У. Мазго.*

Спішыце. У выдзеленых словах падкрэсліце літары, якія абазначаюць галосныя гукі.

**163.** Назавіце літары. Якая літара лішняя?

б, в, г, ж, з, й, к, о, п, т, ў, ф, ц, ч, ш

**164.** Адгадайце загадку. Вымавіце зычныя гукі ў выдзеленым слове.

Хто з вас сёння бачыў (Ж/ж)эню?
(Ж/ж)эня з'ела ягад жменю.
Усё ў роце **пачарнела**.
Што такое (Ж/ж)эня з'ела?
*У. Мацвеенка.*

Запішыце загадку, выбіраючы патрэбныя літары з дужак. Растлумачце правапіс літар.



Правообладатель Национальный Институт образования

**165.** Прачытайце скорагаворку. Вымавіце зычныя гукі ў выдзеленых словах. Якія словы адрозніваюцца адным зычным гукам?

Зва́ла па маліны
**Марына** Галіну,
Галіна Марыну
зва́ла па **каліну.**
*Васіль Вітка.*



**166.** Прачытайце. Назавіце ў выдзеленых словах зычныя гукі. У якіх словах літар больш, чым гукаў?

Журавінка-ягадзінка,
**ву́зенькі лісточак,**
у **маленькай** журавінкі —
кветка, як **званочак.**
*А. Дзержынскі.*

Спішыце. У выдзеленых словах падкрэсліце літары, якія абазначаюць зычныя гукі.

**167.** Прачытайце прыказку. Чаму так гавораць?

Свой час ягадзе, свой час **баравіку.**

У выдзеленым слове назавіце галосныя гукі.



Правообладатель Национальный Институт образования



**168.** Адгадайце загадку. З «рассыпаных» літар складзіце слова-адгадку.

**На траве,** як **агеньчыкі,** ружавеюць **вугельчыкі.**




Спішыце загадку разам з адгадкай.

У выдзеленых словах падкрэсліце літары, якія абазначаюць зычныя гукі.

## Вымаўленне і правапіс слоў з *ў*

**169.** Прачытайце назвы птушак.

| | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|
| ласта | ў | ка | ж | у | равель |
| маліна | | ка | б | | сел |
| жа | | рук | к | | лік |

Чым адрозніваюцца гукі [у] і [ў]? Якой літарай абазначаецца гук [ў]?

**Гук [ў] — зычны, гук [у] — галосны.**



Правообладатель Национальный Институт образования

**170.** Прачытайце.

| **па-беларуску** | **па-руску** |
|---|---|
| аўтобус | автобус |
| траўка | травка |
| воўк | волк |

Якімі гукамі адрозніваюцца словы, напісаныя па-беларуску і па-руску?

Спішыце беларускія словы. Падкрэсліце літару ***ў*** разам з папярэдняй літарай.

Пасля якіх літар пішацца ***ў***?

Літара *ў* (*у* нескладовае) пішацца пасля галосных: *леў, праўда, воўк. Улетку Вера жыла ў вёсцы.*

**171.** Прачытайце сказы.

Ластаўкі, жаўрукі, жураўлі — пералётныя птушкі. Восенню яны адлятаюць у вырай.



***вы́рай*** — рус. *тёплые края*

Выпішыце словы з гукам [ў] у алфавітным парадку. Падкрэсліце літару ***ў*** адной рыскай.



Правообладатель Национальный Институт образования

**172.** Прачытайце.

Белавежская пушча самая вядомая ў Беларусі. Гало..ная ўкра́са пушчы — зубр. Зубр — цар звяро.. . Ён самы вялікі і дужы.



***укра́са** — упрыгажэ́нне, краса́*

Якую літару трэба ўставіць у словы? Спішыце сказы, у якіх гаворыцца пра зубра. Устаўце прапушчаныя літары.

***аква́рыум***

**173.** Дапоўніце сказ слоўнікавым словам.



Па..лік запусці.. рыбку ў ... .

Спішыце, устаўляючы прапушчаныя літары.



Ці ёсць у вас або ў вашых знаёмых акварыум? Якіх акварыумных рыбак вы ведаеце? Як пра іх трэба клапаціцца?



**174.** Прачытайце. З кім параўноўваецца вецер? Растлумачце правапіс ***ў***.

Вецер ноччу выў, як воўк,
толькі раніцаю змоўк.



Правообладатель Национальный Институт образования

Пэўна, ён стаміўся выць
і цяпер у садзе спіць.
*В. Кудлачоў.*

Спішыце першы сказ, падкрэсліце літару ***ў*** разам з папярэдняй літарай.

**175.** Прачытайце.

Жоўтае лісце падае на зямлю. Зніклі ластаўкі, жураўлі. Няма матылькоў. Дзень стаў кароткім, ноч — доўгай.

Выпішыце словы з ***ў***. Падкрэсліце літару ***ў*** адной рыскай, а літару, пасля якой пішацца ***ў***, — дзвюма.

**176.** Разгледзьце на малюнку помнік літары ***ў***. Прачытайце тэкст і скажыце, у якім горадзе Беларусі ён устаноўлены.



Гук [ў] адметны ў беларускай мове. Літара ***ў*** ёсць толькі ў беларускім алфавіце і ў алфавіце эскімосаў. У горадзе Полацку пастаўлены помнік літары ***ў***.



Правообладатель Национальный Институт образования

**177.** Прачытайце народныя прыкметы.

Вялікія мурашнікі **ўвосень** — на суровую зіму. Увосень шмат жалудоў на дубах — на цёплую зіму.

У выдзеленым слове растлумачце правапіс літары ***ў***. Падумайце, чаму ў другім сказе гэта слова пачынаецца з ***у***.

Літара ***ў*** не пішацца пасля знакаў прыпынку: *Улетку Вера з бацькамі хадзіла на рэчку, у лес.*

**178.** Прачытайце загадку. З літар, якія схаваліся на малюнку, складзіце адгадку. Спішыце, устаўце літару ***у*** або ***ў***.



..дзень адпачывае, а ..ночы лятае.

**Завяжы вузялок!**
Вялікай літары ***ў*** не бывае.



Правообладатель Национальный Институт образования

**179.** Вусна дапоўніце сказы патрэбнымі словамі.

Дачка **дапамагала** маме.
Сын ... маме.

Унучка **чытала** бабулі кнігу.
Унук ... бабулі кнігу.

Дзяўчынка **пісала** ліст.
Хлопчык ... ліст.

Мама **слухала** радыё.
Тата ... радыё.

Запішыце словы, якімі дапоўнілі сказы. Падкрэсліце літару ***ў***.

У з о р: *дапамагаў*.



**180.** Прачытайце сказы. Пра хлопчыкаў ці дзяўчынак ідзе ў іх размова?

Саша мыла посуд.
Жэня рабіла ўрокі.

Змяніце адно слова ў кожным сказе так, каб размова ў іх ішла пра хлопчыкаў. Запішыце.



Правообладатель Национальный Институт образования

**181.** Паслухайце тэкст. Чаму ўцёк Уладзік? Як незнаёмы хлопчык абараніў Ганначку? Чаму ён прыйшоў на дапамогу дзяўчынцы?



## Выратавальнік

Уладзік і Ганначка вярталіся са школы. Ішлі і паціху гаварылі. **Раптам ..ладзік абярну..ся і кінуся наўцёкі.**

Ганначка ледзь не самлела. Вялізны сабака бег проста на яе. Ён бы.. злосны і гырка.. . Дзя..чынка ад страху заплюшчыла вочы.

Раптам незнаёмы хлопчык падбег да Ганначкі і стаў паміж дзя..чынкай і сабакам. Сабака спыні..ся і грозна гляну.. на хлопчыка. Але той не варухну..ся. Сабака апусці.. вочы і адбег ад дзяцей.



Правообладатель Национальный Институт образования

Прачытайце тэкст. Якія літары трэба ўставіць у словы? Растлумачце свой выбар.

Спішыце выдзелены сказ. Падкрэсліце літары, якія ўставілі.

**182.** Прачытайце прыказкі. Чаму ў добрага чалавека шмат сяброў?

1. У добрага чалавека заўсёды многа сяброў. 2. Добраму ўсюды добра.

Растлумачце правапіс ***ў***. Запішыце другую прыказку пад дыктоўку настаўніка.

**183.** З «рассыпаных» літар складзіце словы і запішыце іх. Падкрэсліце ***ў***.

д, з, ч, ы, н, я, ў, к, а
с, р, я, б, о, ў, а, к

Вусна дапоўніце сказы патрэбнымі словамі.

Аленка — добрая … .
… заўсёды дапамагае ўсім у класе.


Гульня «Чароўныя фарбы» (у — ў). 



Правообладатель Национальный Институт образования



**184.** Прачытайце. Выберыце літары, якія трэба ўставіць у словы. Запішыце верш.

Таня (у/ў)стала раніцай,
вокны (у/ў)се памыла,
кажа маме: «Я ў пакой
сонейка ўп(у/ў)сціла».

*П. Прануза.*

## Склад. Падзел слоў на склады

| **па-беларуску** | **па-руску** |
|---|---|
| склад | слог |

**Успомніце з урокаў рускай мовы**

Як даведацца, колькі ў слове складоў?

**185.** Вымавіце словы па складах.

Мароз, завіруха, сняжынка, іней, снег.

Колькі ў кожным слове складоў? Як вы пра гэта даведаліся? Спішыце словы, падзяляючы іх на склады.

Колькі ў слове галосных гукаў, столькі і складоў: *лёд, зі-ма, хо-лад, за-ве-я.*



Правообладатель Национальный Институт образования

**186.** Дапоўніце словы неабходнымі складамі. Запішыце словы.

| | | | |
|---|---|---|---|
| сцю.. | жасць | мяцелі.. | я |
| хо.. | лад | заве.. | мець |
| све.. | жа | за.. | ца |

**Завяжы вузялок!**

Складам можа быць адзін галосны гук: *а-рэх*.

**187.** Прачытайце верш. На каго падобная ў ім сцюжа? Вымавіце словы першага сказа па складах.

*сцю́жа*

Сцюжа скокі пачала,
паскакала да сяла.
Хай сваволіць! Хай злуе!
Не баюся я яе.

*С. Сокалаў-Воюш.*

***сваво́ліць*** — тут: *бушу́е, ху́тка выяўля́е сваю́ сі́лу*

Выпішыце з першага сказа словы з двух складоў. Падкрэсліце літары, якія абазначаюць галосныя гукі.



Правообладатель Национальный Институт образования

**188.** Паслухайце тэкст. За што сінічка падзякавала людзям? Як яна гэта зрабіла?



У суботу Дзяніска з татам майстравалі кармушку.

У нядзелю было сонечна. Яны прымацавалі кармушку на балконе. Вераб'ям насыпалі проса. Сініцам паклалі кавалачкі сала. Праз некалькі хвілін вераб'і ўжо знайшлі корм. Яны падсілкаваліся просам і паляцелі. Сінічкі пачаставаліся салам. Адна птушачка падляцела да акна і асцярожна стукнула дзюбай у шкло. Так сінічка падзякавала людзям. *(Паводле Т. Мушынскай.)*

***падсілкава́ліся*** — *падкармі́ліся*
***про́са*** — рус. *пшено́*

Рм Дапоўніце сказ слоўнікавым словам.

Трэба дапамагаць птушкам у зімовую... .

Запішыце сказ. Падкрэсліце ў словах літары, якія абазначаюць галосныя гукі. Абазначце лічбамі над словамі колькасць складоў.



Правообладатель Национальный Институт образования

**189.** Памяняйце месцамі склады і назавіце зімовыя месяцы. Чаму яны так называюцца?



жань-сне
дзень-сту
ты-лю

Запішыце назвы зімовых месяцаў.

Колькі ў кожным слове складоў? Гукаў? Літар?



**190.** Прачытайце скорагаворку. Запішыце, устаўляючы патрэбныя літары.

У **мале́нькай** (С/с)ані (С/с)ані едуць **самі.**

Над выдзеленымі словамі лічбай укажыце колькасць складоў.

**191.** Прачытайце словы. Памяняйце месцамі склады ў іх і запішыце новыя словы.

Нара, рака, рама, зала, мала, ласі.

Узор: *нара — рана, ... .*



Правообладатель Национальный Институт образования

**192.** Прачытайце. Каго нагадвае завіруха ў гэтым вершы?

## Завіруха

Выйшла завіруха пагуляць —
надакучыў ціхі адпачынак.
З ветрам, з карагодамі сняжынак
выйшла завіруха пагуляць.

*М. Чарняўскі.*

Знайдзіце ў вершы словы з трох складоў.

Запішыце першы сказ. Над словамі лічбамі абазначце колькасць складоў.

Рм Як яшчэ можна назваць завіруху?

**193.** Памяняйце месцамі склады і запішыце словы. Што аб'ядноўвае іх?

1) жын-сня-ка; 2) сне-вік-га; 3) кі-снеж; 4) сня-ка-гур.

Падкрэсліце ў словах літары галосных гукаў.



**194.** Прачытайце і адгадайце загадку.

Слова гэта, пэўна, знаеш?
Азначае аўтагонкі.



Правообладатель Национальный Институт образования

Літары як пераставіш —
Інструмент музычны, звонкі.
*У. Мацвеенка.*





**195.** Спішыце верш, падзяляючы на склады выдзеленыя словы.

Ходзіць **студзень,**
**студзіць** студзень,
цэлы **месяц** холад будзе.
**Вецер** зябкі шуміць,
а **мароз** яшчэ трашчыць.
*А. Дзеружынскі.*

**196.** Прачытайце і адгадайце загадку. Як ратуе снег жывёл у зімовую сцюжу?

**Зімовая загадка**

У якой пярыне
зайчык не прастыне?
Ля якой падушкі
ён пагрэе вушкі?
*Д. Бічэль.*



Запішыце адгадку. Падзяліце слова на склады.



Правообладатель Национальный Институт образования

**197.** Паслухайце верш. Што хацеў зрабіць мядзведзь? Што ён сказаў пра зіму? Як вы разумееце апошні сказ?

## Мядзведзь

**Заявіў** звярам **мядзведзь:**
— Хачу студзень паглядзець!
Не **пайду** ў бярлогу спаць,
лапу ўсю зіму смактаць.
Дый **зіма** цяпер не тая —
завіруха не **гуляе**
і марозы не трашчаць.
Не хачу ў бярлозе спаць...
А зіма пачула гэта —
**спаў** мядзведзь ажно да лета.

*С. Чыгрын.*



*мядзве́дзь*

Выпішыце выдзеленыя словы, падзяліце іх на склады. Падкрэсліце слова, якое нельга падзяліць на склады.



Якіх вы ведаеце дзікіх жывёл, што ўпадаюць у зімовую спячку? Чаму яны гэта робяць?



Правообладатель Национальный Институт образования

**198.** Прачытайце. Спішыце.

Снежна ў снежні месяцы.
Снег засыпаў весніцы. *(С. Шушкевіч.)*

***ве́сніцы — varо́ты***

Абазначце лічбамі над словамі колькасць складоў.

**199.** Адгадайце словы. «Збярыце» сняжынкі са складамі. Запішыце і запомніце народную прыкмету.




**200.** Прачытайце прыказку. Чаму так гавораць?

Зіма на лета працуе, а лета на зіму.

Якое слова ў прыказцы мае большую колькасць складоў?



Правообладатель Национальный Институт образования



**201.** Прачытайце. Спішыце.

*Вавёрка — добрая гаспадыня. На зіму яна рыхтуе запасы арэхаў і жалудоў.*

Абазначце лічбамі над словамі колькасць складоў.

## Перанос слоў

### Успомніце з урокаў рускай мовы

Як пераносяцца словы з аднаго радка на другі?

**202.** Прачытайце словы. Колькі складоў у кожным слове? На склады ці для пераносу падзелены словы?

Пляцоў-ка, скакал-ка, вела-сіпед, са-макат, валей-бол, ра-кетка.

Як яшчэ можна перанесці гэтыя словы? Запішыце іх, падзяліўшы для пераносу па-іншаму.



Правообладатель Национальный Институт образования

Словы пераносяцца з аднаго радка на другі па складах: *ха-кей, сня-жын-ка.*

Склад з адной літары нельга пакідаць на радку ці пераносіць на новы радок: *за-вея, Ірын-ка, іней.*

**203.** Прачытайце верш.

## Сам і саначкі вазі

Хто на санкі, хто на лыжы —
выбірай, каму што блі́жай.
Ды за правіла вазьмі:
сам і саначкі вазі!

*У. Паўлаў.*



***блі́жай*** — *бліжэ́й, больш блі́зка*

Спішыце першы сказ, падзяляючы словы для пераносу. Якія словы нельга падзяліць для пераносу?

**204.** Прачытайце верш.

Чэмпіён між нас — **Я-гор-ка,**
першы ён ва ўсім, бадай,



Правообладатель Национальный Институт образования

і **я-му лю-ба-я** горка
ды з трамплінам — не бяда.
*А. Камароўскі.*

Выдзеленыя словы падзелены на склады ці для пераносу? Падзяліце іх для пераносу і запішыце. Якое слова нельга падзяліць для пераносу?

Літары ***й, ў, ь*** пры пераносе не аддзяляюцца ад папярэдняй літары.

**205.** Знайдзіце 5 слоў — назваў рэчаў, неабходных для зімніх гульняў. Выпішыце гэтыя словы. Падзяліце іх для пераносу.

| | | | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|---|---|
| к | а | н | ь | к | і | с | р |
| л | ы | ж | ы | м | в | а | а |
| ю | к | р | с | т | а | н | к |
| ш | а | й | б | а | ў | к | е |
| к | о | м | п | а | ч | і | т |
| а | б | в | м | я | ч | о | к |
| с | к | а | к | а | л | к | а |

**Рм** Адкажыце на пытанне, выкарыстайце малюнкі і прапанаваныя словы.



Правообладатель Национальный Институт образования

Чым ты любіш займацца зімой?

1. Я люблю катацца на ... .







2. Я люблю гуляць у ... .

*сне́жкі*





*хакей*

Адказ запішыце.



**206.** Прачытайце верш. Які настрой перадаецца ў ім?

Лёдам бліскае каток,
ззяе востры мой канёк.
Марш бадзёры загучыць —
лёд ад радасці звініць.

*Т. Мушынская.*

Спішыце першы сказ, падзяляючы словы для пераносу.



Правообладатель Национальный Институт образования

**207.** Прачытайце прыказку.

Студзень зямлю студзіць.

Назавіце гукі ў словах. Вусна падзяліце словы на склады. Як можна падзяліць словы для пераносу?

Спалучэнні літар ***дз*** і ***дж***, якія абазначаюць гукі [дз'] і [дж], пры пераносе слоў не раздзяляюцца: *даж-**джы**, ра-**дзі**ма*.

**208.** Прачытайце тэкст. З чым параўноўваецца снег? Чаму?

На голай зямлі ў маразы вымярзае жыта. Часта гінуць кусты і **маладзенькія саджанцы**. Хто іх выратуе? Снег! Ён, як зімовая **адзежа**, пакрывае зямлю і расліны. Праз глыбокі пласт снегу марозу не дабрацца да каранёў раслін. Снег ратуе **ўраджай**.

Выпішыце выдзеленыя словы, падзяліце іх для пераносу.



Правообладатель Национальный Институт образования

**209.** Прачытайце словы. Знайдзіце адпаведныя прадметы на малюнках. Выпішыце ў адзін слупок назвы зімовага адзення, а ў другі — зімовага абутку. Падзяліце іх для пераносу.

1.



9.



8.



2.



| | | | | | | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| | | | ф | у | т | р | а | | | |
| | ш | | к | а | ж | у | х | | | |
| ч | а | р | а | в | і | к | і | | | |
| | п | | | | | а | | | | |
| | к | | | | | в | | б | | |
| | а | | п | а | л | і | т | о | | |
| | | п | а | л | ь | ч | а | т | к | і |
| | | ш | а | л | і | к | | ы | | |
| | | | | | | і | | | | |

7.



5.



3.



4.



6.



**Рм** Як вы апранаецеся на прагулку зімой?



Правообладатель Национальный Институт образования

**210.** Прачытайце верш. Чым заняты кожны член сям'і? Як вы разумееце выраз *не сядзіць без справы*? Хто такі абібок?

## Абібок

Мама вяжа рукавічкі,
я ваксую чаравічкі.
А на кухні дзед з бабуляй
мыюць міскі і каструлі.
Не сядзіць без справы тата —
робіць санкі-самакаты.
Толькі коцік, абібок,
каля грубкі грэе бок.

*М. Хамянкоў.*

***гру́бка** — невялі́кая пакаёвая печ*

Спішыце першы сказ, падзяляючы словы для пераносу.

**211.** Прачытайце. Якімі з прапанаваных слоў можна замяніць слова *абібок*? Запішыце гэтыя словы, падзяляючы іх для пераносу.

Лянівец, гультай, ле́жань, памочнік.



Правообладатель Национальный Институт образования



**212.** Прачытайце, адгадайце загадку.

Як **сапраўдны фантазёр,**
ён **кладзе** на **шыбы ўзор.**
**Размалёўвае** іх так,
што зайздросціць і **мастак.**
*С. Шах.*





***зайздро́сціць*** — рус. *заві́дует*

Выпішыце выдзеленыя словы. Падзяліце іх для пераносу. Якое слова нельга падзяліць для пераносу? Чаму?

## Націск

| **па-беларуску** | **па-руску** |
|---|---|
| націск | ударение |

**Успомніце з урокаў рускай мовы**

Які склад называецца націскным?

**213.** Прачытайце словы, выдзяляючы голасам націскныя склады.

Талерка, скаварада, кубак, каструля, чайнік.



Правообладатель Национальный Институт образования

Склад, які вымаўляецца мацней за іншыя склады, называецца націскным: *ква-тэ́-ра, ку́-хня*. Усе астатнія склады ў слове — ненаціскныя.

**214.** Прачытайце. Спішыце.

Маленькая (В/в)ерка
разбіла талерку.
Баіцца прызнацца —
без цукерак застацца.
*Н. Дзівіна.*

Пастаўце націск у словах. Падкрэсліце націскныя склады.

*тале́рка*

**215.** Прачытайце прыказку. Чаму так гавораць?

Зямля — **талерка:** што пакладзеш, тое і возьмеш.

Спішыце. Абазначце націскны склад у выдзеленым слове.

**216.** Вызначце ў словах націскныя склады. З націскных складоў складзіце новыя словы.



Правообладатель Национальный Институт образования

1. Маша, тулава, Каляды.
2. Багата, паратунак, елачка.
3. Вязынка, Чэхія, беларусы.

Са слоў, якія ў вас атрымаліся, складзіце і запішыце сказ.

**217.** Прачытайце. Спішыце, пастаўце націск у словах. Чым адрозніваюцца выдзеленыя словы?



Не насеяла мукі
нават і на піражкі.
Гэта ж **мука** — не **мука**:
(ў/у)ся ў дробных камяках.

*Н. Стражава.*



**218.** Вызначце ў словах націскныя склады. З націскных складоў складзіце новыя словы.

1. Маліны, рамонкі.
2. Рака, шафа.
3. Маша, Мілана, Коля.

Запішыце словы, якія атрымаліся, абазначце ў іх націск.



Правообладатель Национальный Институт образования

**219.** Дапоўніце сказы патрэбным слоўнікавым словам і запішыце.

Вялікая ... — гэта блюда. Кубак, сподак, ... — гэта посуд.



***спо́дак* — *невялі́кая тале́рка***

Абазначце ў словах націскныя склады.

**220.** Прачытайце. Якая прымаўка сустрэлася ў вершы? Чаму так гавораць?

### Дзедаў крупнік

Ах! — гарачы, ох! — духмяны,
смачны **крупнічак** аўсяны!
Ён смятанкаю заліты —
есць Валера з апетытам.
Дзед **жартуе:** — Еш да дна,
бо ёсць **прымаўка** адна:
«Хто да дна **талеркі** дойдзе,
там сваё здароўе знойдзе».

*У. Мацвеенка.*

Выпішыце выдзеленыя словы, пастаўце ў іх націск. Падкрэсліце ненаціскныя склады.



Правообладатель Национальный Институт образования

**221.** Прачытайце. Назавіце адным словам.

Кампот, дранікі, суп, бліны, пірог, катлета, бабка, халадзец, каўбаса.

Выпішыце спачатку словы, у якіх націск падае на першы склад, потым — на трэці.

**222.** Прачытайце. Назавіце пару слоў, якія адрозніваюцца месцам націску.

Адышоў я ад пліты,
кажу Вары:
— Ты вары.

*Н. Сторажава.*



Гульня «Пакармі птушку».





**223.** Спішыце, падкрэсліце ў словах націскныя склады.

1. Бацька, бубен, паляна.
2. Пяты, цячэ.
3. Блізка, штаны.

З націскных складоў вусна складзіце новыя словы. Са слоў, якія ў вас атрымаліся, складзіце і запішыце сказ.



Правообладатель Национальный Институт образования

## Будзьце ўважлівыя

Словы беларускай і рускай моў адрозніваюцца месцам націску.

| па-беларуску | па-руску |
|---|---|
| крапіва́ | крапи́ва |
| дачка́ | до́чка |
| імя́ | и́мя |
| ваўкі́ | во́лки |

**224.** Прачытайце тэкст. Правільна пастаўце націск у словах. Чаму Аленку называюць мамінай дачкой?

Аленка — маміна дачка. Куды мама, туды і яна! І кватэру разам прыбіраюць, і ў парк ходзяць, і на дачу ездзяць. На дачы Аленка дапамагае матулі палоць кветкі. Хоць там і крапіва расце, але дзяўчынка не баіцца.

Нават імя ў яе такое, як у мамы. Толькі матулю завуць Алена Пятроўна, а дачушку — проста Аленка.

Выпішыце словы, якія адрозніваюцца месцам націску ў беларускай і рускай мовах. Абазначце ў іх націск.



Правообладатель Национальный Институт образования

**225.** Паслухайце тэкст. Што рабіла бабуля з халадцом? Як вы разумееце выраз *разліваць у талеркі*? Ці ведаў пра гэта Лёнька?

## Як правільна гаварыць



На кухні бабуля разлівала ў талеркі **халадзец.** Да яе падышоў **маленькі** Лёнька і спытаў, што яна робіць.

— Халадзец **разліваю,** — адказала бабуля.

Хлопчык **паглядзеў** на бабулю, потым на талеркі, падумаў і кажа:

— Бабуля, ты няправільна гаворыш.

— Чаму няправільна? А як трэба гаварыць?

— Трэба гаварыць «наліваю». Ты ж халадзец наліваеш у талеркі, а не разліваеш. Разліваюць толькі малыя. *(П. Рунец.)*

Выразна прачытайце тэкст па ролях.

Выпішыце выдзеленыя словы, пастаўце ў іх націск. Па слоўніку праверце правільнасць пастаноўкі націску ў слове *маленькі*.



Правообладатель Национальный Институт образования

**226.** Адгадайце загадку. З «рассыпаных» складоў складзіце слова-адгадку.




Кожны дзень са зброяй гэтай
я палю́ю на катлеты.
З першай спробы ў іх пацэліць
вастразу́бы мой … .

*А. Черашкова.*

Запішыце адгадку, вызначце ў слове націскны склад. Падкрэсліце пераднаціскны склад.

**Рм** Вусна адкажыце на пытанні.

Якія прыборы ляжаць побач з талеркай? Як іх раскладаюць, калі накрываюць на стол?



*відэ́лец*

**227.** Дапоўніце сказы патрэбнымі словамі.

Раніцай мама **гатуе** … .
Днём бабуля прыгатавала **сытны** … .
**Увечары** ў нас на стале смачная … .

Словы для даведкі: *вячэра, снеданне, абед.*



Правообладатель Национальный Институт образования

Вызначце націскныя склады ў выдзеленых словах. Спішыце адзін сказ на выбар.



**228.** Прачытайце верш. Кім уяўляе сябе дзяўчынка, калі гуляе з лялькамі?

**Наша (Ю/ю)ля — гаспадыня.**
**Не, вячэра не астыне!**
**Лялек садзіць ля стала,**
**бо вячэраць ім пара.**

*Т. Мушынская.*

Спішыце. Пастаўце націск у словах.

## Галосныя гукі [о], [э] — [а]. Правапіс слоў з літарамі *о, э — а*

**229.** Прачытайце пары слоў.

**жо́луд — жалуды́**
**ко́лас — каласы́**
**боб — бабы́**
**рэ́кі — рака́**
**цэ́ны — цана́**
**стрэ́лы — страла́**

Назавіце націскныя склады. Якія галосныя гукі вымаўляюцца пад націскам у выдзеленых складах? Якія галосныя гукі вымаўляюцца замест іх у ненаціскных складах?



Правообладатель Национальный Институт образования

У беларускай мове літары ***о, э*** пішуцца ў націскных складах. У ненаціскных складах замест іх пішацца ***а***: *мо́ст — масты́, стрэ́хі — страха́*.

**230.** Разгледзьце схему на форзацы. З апорай на яе раскажыце правіла правапісу слоў з літарамі ***о, э — а***.

Прыдумайце і намалюйце сваю схему або малюнак, якія дапамагаюць запомніць правапіс ***о, э — а***.

**231.** Прачытайце словы. Вызначце ў іх націскныя склады. Растлумачце, якія літары трэба ўставіць у словы.

Дом — д..мы, д..мік.
Дрэва — др..ўца, др..ўляны.
Гара — г..рка, г..рысты.

Спішыце, падкрэсліце літары, якія ўставілі.

**232.** Прачытайце. Што здарылася з Рыгоркам? Чаму Жэню і Рому можна назваць сапраўднымі сябрамі?



Правообладатель Национальный Институт образования

Рыгорка **хворы.** Сумна **хварэць:** ні з татам на **рэчку,** ні з сябрамі на **горку** нельга пайсці. А **гара** каля **ракі** высокая і снежная! Хлопчыкі з самага ранку там катаюцца.



Выглянуў Рыгорка ў акно. А там — снегавік! Усміхнуўся хлопчык. Гэта сябры Жэня і Рома зляпілі яму снегавіка.

Выпішыце выдзеленыя словы. Вызначце ў іх націскныя склады. Растлумачце правапіс літар ***о, э — а***.

Рм Раскажыце, як вы клапоцціцеся пра сяброў.

**233.** Прачытайце. Змяніце словы ў дужках так, як патрабуе сэнс. Пастаўце націск у гэтых словах. Растлумачце, чаму змяніліся галосныя.

Зімой *(ракá)* пакрываюцца лёдам.
Дзеці катаюцца на санках з *(гóры)*.

Спішыце адзін сказ на выбар.



Правообладатель Национальный Институт образования



**234.** Прачытайце скорагаворку.



Б..б ды б..б — два б..бы́,
а яшчэ б..б — тры б..бы́.

Спішыце. Устаўце замест кропак ***о*** або ***а***.

**235.** Прачытайце. Растлумачце напісанне літар ***о, э — а*** ў выдзеленых словах.

Я пусціўся ў **скокі** — бачу:
дзевяць **хлопцаў** «Бульбу» скачуць.

*Э. Агняцвет.*

Змяніце словы так, каб замест ***о*** стала ***а***.

Пра якую «Бульбу» ідзе размова ў вершы? Якія яшчэ танцы вы ведаеце?

Рм **236.** Прачытайце. Дапоўніце сказы патрэбнымі словамі па ўзоры.



Слон вялікі, а ... маленькае.



Правообладатель Национальный Институт образования

Воўк вялікі, а  ... маленькае.

Лось вялікі, а  ... маленькае.

Кот вялікі, а  ... маленькае.

С л о в ы д л я д а в е д к і: *сланяня, ваўчаня, ласяня, кацяня.*

У з о р. *Слон вялікі, а сланяня маленькае.*

Запішыце два сказы на выбар. Растлумачце ў словах напісанне літар ***о, а***. Вусна прыдумайце свае сказы.

**237.** Прачытайце. Колькі кацянят заскакала ў танцы? Як вы думаеце, на які беларускі танец падобны «Кашачок»?

К..шка грае на раялі,
к..цяняты заск..калі:



Правообладатель Национальный Институт образования

восем лапак ск..к ды ск..к —
слаўны танец «Кашачок».
*Н. Галіноўская.*

Вызначце месца націску ў словах з прапушчанымі літарамі. Выпішыце гэтыя словы, устаўце замест кропак літару ***о*** або ***а***.

**238.** Прачытайце тэкст. Якія літары трэба ўставіць у словы? Растлумачце іх напісанне.

У лесе пачуўся тр..ск. Гэта тр..шчаць галіны пад капытамі л..ся. Л..сь — лясны волат, а нікога не крыўдзіць. Р.́.гі л..сіныя нібы карона. *(У. Ягоўдзік.)*

Спішыце два апошнія сказы. Падкрэсліце літары, якія ўставілі.



**239.** Прачытайце скорагаворку. Навучыцеся правільна вымаўляць яе.

В..ўк в..ўчаня авечак браць вучыць.

Як называюць дзіцянё авечкі?

Назавіце літары, якія прапушчаны ў словах. Спішыце, растлумачце іх правапіс.



Правообладатель Национальный Институт образования

**240.** Прачытайце верш. Кім марыць стаць хлопчык? Чым вы хочаце займацца, калі вырасцеце?



Я малюю матроску
і кашулю ў **пал..ску**,
бесказырку, ззаду стужкі,
на іх — якары, як птушкі,
карабель, у хвалях **м..ра**.
Падрасту і стану **ск..ра**
я сапраўдным **м..раком** —
і пакіну **р..дны д..м**.

*Н. Галіноўская.*

Выпішыце выдзеленыя словы. Устаўце патрэбныя літары, растлумачце іх напісанне.

**241.** Прачытайце скорагаворку. Што робіць тачыльшчык?

## Тачыльшчык

Т**а**чу, тачу, абт**о**чваю,
на́чыста зат**о**чваю,
канцы з канцамі ст**о**чваю.

*Васіль Вітка.*

Растлумачце напісанне выдзеленых літар.



Правообладатель Национальный Институт образования

**242.** Дапоўніце сказы патрэбнымі словамі. Растлумачце іх напісанне.

**Пчолы** паляцелі ў вулей.  села на кветку.

**Совы** жывуць у лесе.  — начная птушка.

**Козы** пасвяцца на лузе.  дае малако.

Запішыце сказы, якія дапоўнілі словамі, пад дыктоўку.

*тэа́тр*

**243.** Прачытайце словы. Растлумачце, якія літары трэба ўставіць у іх.

уч..ра – уч..рашні

Дапоўніце патрэбнымі словамі сказы.

... настаўніца і вучні наведалі лялечны тэатр. ... паход вельмі спадабаўся дзецям.

Запішыце першы сказ. У слоўнікавым слове падкрэсліце літару ненаціскнога галоснага гука.



Правообладатель Национальный Институт образования



**244.** Прачытайце. Растлумачце, якія літары трэба ўставіць у словы. Спішыце.

Кожная с..сна свайму б..́ру песню спявае.
З р..днага б..́ку і в..рона мілая.

**245.** Прачытайце словы. Растлумачце, якія літары трэба ўставіць на месцы пропускаў.

Галава — гал..ўка, гал..ўны ўбор; вочы — в..чкі, в..чаняты; шчокі — шч..чкі, шч..ка; дрэва — др..ўца, др..ўляны стол.

Спішыце словы, у якія ўстаўлялі літары. Абазначце націск у іх.

Рм Назавіце вядомыя вам галаўныя ўборы.

**246.** Прачытайце верш. Як мама-кошка ставіцца да сваіх кацянят? Якія словы падказалі вам гэта?

К..цянятак к..шка мыла.
Без мачалкі і без мыла,
без шампуню, ручніка —
з дапам..гай языка,





Правообладатель Национальный Институт образования

цёплага, пяшчотнага,
крышачку вільготнага.
*Н. Галіноўская.*

***пяшчо́тны*** — *ласка́вы*
***вільго́тны*** — *мо́крьі*

Растлумачце напісанне прапушчаных літар у словах.

**247.** Дапоўніце сказы патрэбнымі словамі. Растлумачце іх напісанне.

1. У Аленкі доўгая  .

2. Мама расчасала дачушцы валасы і запляла ў  .

3.  трапіла ў цэль.

4. Кветкі цыбулі падобныя на  .

Запішыце два сказы на выбар.



Правообладатель Национальный Институт образования

**248.** Спішыце, устаўляючы ў словы патрэбныя літары.

Р..спубліка Беларусь — р..спубліканскі суботнік;
т..атр — т..атральная афіша.

Што змяшчаецца на тэатральнай афішы?

Для чаго арганізоўваецца рэспубліканскі суботнік? Калі ён звычайна праводзіцца? Пры неабходнасці запытайцеся пра гэта ў бацькоў.


**249.** Прачытайце верш. Як смоўж ратуецца ад небяспекі?

Расцягнуўся ўздоўж
сцежкі вузкай смоўж.
Д..м ён н..сіць на спіне,
і як хто яго кране,
смо..ж адразу — у д..мок,
дзверы — на замок.

*В. Іпатава.*

Спішыце другі сказ, устаўляючы ў словы патрэбныя літары. Растлумачце іх напісанне.



Правообладатель Национальный Институт образования

## Правапіс слоў з літарамі е, ё — *я*

**250.** Прачытайце пары слоў.

**сёстры** — ся|стра (1) **лес** — ля|сы (1)
**гнёзды** — гня|здо (1) **вецер** — вя|тры (1)

Вызначце націскныя склады ў словах. Якія літары пішуцца ў націскных складах выдзеленых слоў? Якая літара пішацца замест **е, ё** ў першым складзе перад націскам?

> У першым складзе перад націскам замест літар ***е, ё*** пішацца ***я***: *цёмны — цямне́ць, све́тлы — святло́*.

**251.** Разгледзьце схему на форзацы. З апорай на яе раскажыце правіла правапісу слоў з літарамі **е, ё — *я***.

Прыдумайце і намалюйце сваю схему або малюнак, якія дапамагаюць запомніць правіла правапісу **е, ё — *я***.

**252.** Спішыце. Устаўце літару **е, ё** або ***я***. Абазначце націск у словах, падкрэсліце першы склад перад націскам.



Правообладатель Национальный Институт образования

Снег — сн..гі, сн..жынка.
Звер — зв..ры, зв..рыны.
Лёд — л..док, л..довы.

**253.** Прачытайце. Выпішыце выдзеленыя словы парамі, пастаўце ў іх націск. Падкрэсліце першы склад перад націскам.

У з о р: *лёд — лядко́м.*

1. Цэлы дзень ішоў **снег. Сняжок** пакрыў палі і лугі. 2. На рацэ блішчыць **лёд.** Лужыны зацягнула тонкім **лядком.** 3. **Дзень** быў ціхі і марозны. Спадабаўся нам гэты **дзянёк.** 4. На снезе кожны **звер** пакідае свой **след.** У лесе шмат **звярыных слядоў.**

**254.** Прачытайце прыказку. Чаму так гавораць?

Студзень з..млю студзіць, ды надзею на в..сну грэе.

Якія літары трэба ўставіць замест пропускаў? Растлумачце напісанне літар ***е, ё — я***.

Спішыце. Падкрэсліце літары, якія ўставілі.



Правообладатель Национальный Институт образования

**255.** Прачытайце верш.

## Ёлка



Ёлачка-баро́вачка
ў хатку да цяпла
ад шэрага воўка
з бору ўцякла.
Мы ёй падарылі
цацкі і шары,
зоркай азарылі —
гары́, гары́!
А навокал ёлкі
танцы і смех.
Развяжы, дзядуля,
з цукеркамі мех!

*Д. Бічэль.*

Растлумачце напісанне выдзеленых літар.

**Рм** Раскажыце, як ваша сям'я святкуе Новы год? Выкарыстайце прапанаваныя словы і спалучэнні слоў.

Упрыгожваем ёлку, рыхтуем падарункі, ходзім у госці, загадваем жаданні, весялімся, спяваем песні, падарункі Дзеда Мароза.



Правообладатель Национальный Институт образования

**256.** Разгадайце рэбус. Запішыце слова. Растлумачце ў ім напісанне літары ***я***.

$$\frac{\text{ак}}{\text{вячор}}$$

Вусна дапоўніце гэтым словам сказ.

Пара́ перад самым вечарам — гэта ... .



**257.** Прачытайце і адгадайце загадку.

Б..лым пухам зам..ло
і дарогі, і с..ло.
Мост праз рэчку хутка ляжа,
а што гэта, хто адкажа?

*У. Мацвеенка.*

Спішыце першы сказ. Устаўце літары ***е, ё*** або ***я***, растлумачце іх напісанне.

Запішыце слова-адгадку.

**258.** Змяніце словы па ўзоры. Запішыце іх і абазначце націск. Падкрэсліце першы склад перад націскам. Растлумачце правапіс.

| | |
|---|---|
| *звер — <u>звя</u>ро́к* | *мётлы — <u>мят</u>ла́* |
| лес — ... | вёсны — ... |
| дзень — ... | землі — ... |



Правообладатель Национальный Институт образования

**259.** Прачытайце словы. Вызначце ў іх націскныя склады.

| | | |
|---|---|---|
| **лес** | **лясок** | **ле-са-вік** |
| **цёмны** | **цямней** | **цем-на-ва-ты** |
| **вясёлы** | **весяліць** | **ве-се-ла** |

Якія літары пішуцца пад націскам у словах першага слупка? Чаму ў словах другога слупка замест **е, ё** пішацца ***я***? Якая літара пішацца замест **ё** ў словах трэцяга слупка? Разгледзьце схему.

| | | ´ |
|---|---|---|
| .е | | |

Якое слова з трэцяга слупка адпавядае ёй? Намалюйце схемы астатніх слоў гэтага слупка.

Спішыце словы трэцяга слупка. Пастаўце ў іх націск. Падкрэсліце склады з літарай **е**.

У з о р: *лесаві́к*.

**Завяжы вузялок!**

У другім, трэцім і іншых складах перад націскам, а таксама пасля націску
3 2 1
пішацца ***е***: *це-це-ру-кі́*, *во́-зе-ра*, *ве́-цер*.



Правообладатель Национальный Институт образования

**260.** Прачытайце. Чаму снегіру далі такое імя?

У нас сн..гіра можна бачыць толькі зімой. **З першым сн..гам да нас прылятаюць сн..гіры. Сн..гір не баіцца холаду.** Корміцца ён ягадамі рабіны. В..сной, калі растане снег, сн..гіры адл..таюць на поўнач, у родныя м..сціны.

Якія літары трэба ўставіць замест пропускаў? Растлумачце напісанне літар ***е, ё, я***.

Спішыце выдзеленыя сказы. Устаўце прапушчаныя літары, абазначце ў словах націск.

**261.** Якія літары трэба ўставіць замест пытальнікаў, каб атрымаліся словы?

| | | | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|---|---|
| г | ? | р | о | й | | | |
| г | ? | ? | а | і | з | м | |
| ? | ? | ? | ? | ? | с | к | і |

*геро́й*

Дапоўніце кожны радок патрэбным словам.

Смелы, храбры, ... .
См..льчак, храбрэц, ... .
См..ласць, храбрасць, ... .

Запішыце словы, устаўце патрэбную літару.



Правообладатель Национальный Институт образования

## Гаварыце правільна

*Зане́слі, заве́злі, забе́глі.*

Рм **262.** Дапоўніце сказы патрэбнымі словамі з рубрыкі «Гаварыце правільна».



Пад Новы год тата і мама ... Ірынку і Косціка ў вёску да бабулі і дзядулі. Дзеці хуценька ... ў хату. Яны першымі павіншавалі бабулю і дзядулю са святам. Следам у хату ўвайшлі мама з татам і ... сумкі з падарункамі.

Растлумачце правапіс выдзеленых літар.



**263.** Прачытайце. Пастаўце націск у словах. Якія літары трэба ўставіць у словы?

У снежні сн..жынкі занеслі сц..жынкі.

Студзень — году пачатак, зіме — с..рэдзіна.

Спішыце. Устаўце ў словы літары ***е, ё*** або ***я***.



Правообладатель Национальный Институт образования

**264.** Разгадайце рэбус і даведайцеся, якая птушка начуе ў снезе.




*дзяцел* *сініца* *снягір* *бусел* *сарока*

Запішыце слова-адгадку. Растлумачце напісанне літар ***е, я*** ў ім.

**265.** Прачытайце скорагаворку. Навучыцеся правільна вымаўляць яе.

Ц**я**цера цераз бор л**я**цела, ц**е**ц**е**рука знайсці хацела.

Растлумачце напісанне выдзеленых літар.

Рм **266.** Прачытайце. Растлумачце напісанне выдзеленых літар і слоў.

### Сінічка

Аднойчы прыл**я**цела сінічка да **а**кна. Сюды загнала яе **сцюжа**. Гаспадар пашк**а**даваў



Правообладатель Национальный Институт образования

птушку і адчыніў акно. Сінічка паляцела ў хату. Яна прагаладалася і пачала дзяўбці хлебныя крошкі.

Адкажыце на пытанні.

1. Хто прыляцеў аднойчы да акна?
2. Што загнала яе сюды?
3. Што зрабіў гаспадар?
4. Куды паляцела сінічка?
5. Як яна паводзіла сябе?

Вусна перакажыце тэкст па пытаннях.

**267.** З прапанаваных частак састаўце прыказкі. Чаму так гавораць?

Сарока сароку

і верабей сыты.

Пакармі птушак зімой,

бачыць здалёку.

Увосень

яны адплоцяць вясной.

Растлумачце напісанне выдзеленых літар. Запішыце прыказку, якая падыходзіць да зместу тэксту практыкавання 266.



Правообладатель Национальный Институт образования

**268.** Прачытайце. Адкажыце на пытанне.

Я павесіў тры кармушкі.
Прылятайце есці, птушкі.
Неўзаба́ве прыл..целі,
на **к..рмушкі** ўсе паселі –
пяць **в..сёлых в..раб'ёў**,
шэсць прыг..жых **сн..гіроў**.
Дзве **сар..кі**, тры сініцы.
Колькі ўсіх? Хутчэй лічыце.

*М. Пазнякоў.*

Якія літары трэба ўставіць замест пропускаў? Растлумачце іх правапіс.

Запішыце пад дыктоўку настаўніка выдзеленыя словы.



**269.** Адгадайце загадку. З «рассыпаных» літар складзіце слова-адгадку.

Пырх — з г..лінкі на сн..жок.
Сам чырвоны, як сц..жок.

*А. Вольскі.*




Запішыце загадку разам з адгадкай. Падкрэсліце літары, якія ўставілі. Растлумачце іх напісанне.



Правообладатель Национальный Институт образования

**270.** Прачытайце сказы. Якія літары трэба ўставіць у словы на месцы пропускаў? Чаму?

1. Каранасты дуб кідаў **ц..нь** на зямлю. Дзеці адпачывалі ў **ц..ньку** дрэва.
2. Надыходзіў цёплы асенні **в..чар**. **В..чэрні** змрок апускаўся на зямлю.
3. Пчолы збіралі **м..д** з палявых **кв..так**. Над **кв..цістым** лугам стаяў **м..довы** пах.

Выпішыце выдзеленыя словы, устаўляючы прапушчаныя літары.

**271.** Да слоў з левага слупка падбярыце супрацьлеглыя па значэнні словы з правага слупка.

| | |
|---|---|
| цемра | ц..пло |
| холад | св..тло |
| чарнець | в..лікі |
| студзі́ць | б..лець |
| малы | в..сёлы |
| лёгкі | ц..жкі |
| сумны | п..чы́ |

Растлумачце напісанне прапушчаных літар у словах.



Правообладатель Национальный Институт образования

**272.** Спішыце, устаўляючы ў словы прапушчаныя літары. Растлумачце іх напісанне.

высокая дз..ўчынка — малое дз..ўчаня́
в..домае м..сца — м..сцовы жыхар
драўляныя дзв..ры — дзв..рны́ замок

З адным спалучэннем слоў на выбар складзіце сказ.

**273.** Прачытайце. Перакладзіце словы на беларускую мову і запішыце. Пастаўце націск у запісаных словах.

Снежок, ленок, лесник, весна, земля, гнездо, месяц, герой.

Якія словы аднолькава пішуцца ў рускай і беларускай мовах? Якія словы адрозніваюцца вымаўленнем і напісаннем?

Рм Назавіце самы кароткі месяц года.

**274.** Прачытайце прыказкі. Чаму так гавораць? Растлумачце напісанне прапушчаных літар. Спішыце адну прыказку на выбар.

Кожная птушка сваё гн..здо ведае.
Н..разумная птушка свайго гн..зда не шануе.



Правообладатель Национальный Институт образования



**275.** Прачытайце верш. Чым любяць ласавацца сінічкі ў зімовую сцюжу?

### Сінічкі

Мы сінічкі-с..стрычкі,
кал..ровыя спаднічкі.
Каб **ц..плей** нам стала,
дайце крышку сала.
*Н. Галіноўская.*

Спішыце, устаўляючы ў словы прапушчаныя літары. Вусна змяніце выдзеленае слова так, каб замест ***я*** неабходна было пісаць ***ё***.

## Слоўнікавыя словы

аква́рыум
відэ́лец
геро́й
дождж
кватэ́ра
ме́сяц
мядзве́дзь
рукза́к
Рэспу́бліка Белару́сь
сцю́жа
тале́рка
тэа́тр


Правообладатель Национальный Институт образования

# З м е с т

## УСТУПНЫ КУРС


Вывучаем беларускую мову .................. 3
Гук [і], літары ***І, і*** .............................. 6
Апостраф (’) ................................... 12
Гукі [г], [г’], літары ***Г, г*** ................... 15
Гук [ч], літары ***Ч, ч*** ............................ 22
Гук [ў] і яго абазначэнне на пісьме ........ 33
Гук [ц’], літары ***Ц, ц*** .......................... 40
Гук [р], літары ***Р, р*** ............................ 48
Гук [дз’] і яго абазначэнне на пісьме ...... 55
Гук [дж] і яго абазначэнне на пісьме ...... 60


## ГУКІ І ЛІТАРЫ


Гукі мовы ........................................ 65
Абазначэнне гукаў на пісьме літарамі .... 68
Беларускі алфавіт .............................. 71
Напісанне вялікай літары ў словах ........ 76
Галосныя і зычныя гукі ...................... 84
Вымаўленне і правапіс слоў з ***ў*** ............ 88
Склад. Падзел слоў на склады .............. 96
Перанос слоў .................................... 104
Націск ............................................. 111
Галосныя гукі [о], [э]—[а]. Правапіс слоў з літарамі ***о, э—а*** ................................. 119
Правапіс слоў з літарамі ***е, ё—я*** ........... 130

*Слоўнікавыя словы* .............................. 142




Правообладатель Национальный Институт образования

(Назва ўстановы адукацыі)

| Навучальны год | Імя і прозвішча вучня | Стан вучэбнага дапаможніка пры атрыманні | Адзнака вучню за карыстанне вучэбным дапаможнікам |
|---|---|---|---|
| 20 / | | | |
| 20 / | | | |
| 20 / | | | |
| 20 / | | | |
| 20 / | | | |


Вучэбнае выданне

**Свірыдзенка** Вольга Іванаўна

**БЕЛАРУСКАЯ МОВА**

Вучэбны дапаможнік для 2 класа
ўстаноў агульнай сярэдняй адукацыі
з рускай мовай навучання

У дзвюх частках
Частка 1

*Спіс выкарыстаных крыніц знаходзіцца*
*ў другой частцы вучэбнага дапаможніка*

Нач. рэдакцыйна-выдавецкага аддзела *Г. І. Бандарэнка.*
Рэдактар *Л. Ф. Лейкіна.* Вокладка мастака *З. П. Болцікавай.*
Мастакі *К. Ю. Бандарык, А. В. Зіноўева, А. П. Пратасеня, І. А. Салаўёва.*
Камп'ютарная вёрстка *І. У. Шутко.*
Карэктары *Д. Р. Лосік, Н. В. Федарэнка, В. М. Паўлючэнка*

Падпісана да друку 04.05.2020. Фармат 70×90/16.
Папера афсетная. Друк афсетны. Ум. друк. арк. 10,53.
Ул.-выд. арк. 3,8. Тыраж 128 490 экз. Заказ

Навукова-метадычная ўстанова «Нацыянальны інстытут адукацыі»
Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь. Пасведчанне аб дзяржаўнай рэгістрацыі
выдаўца, вытворцы, распаўсюджвальніка друкаваных выданняў
№ 1/263 ад 02.04.2014. Вул. Караля, 16, 220004, г. Мінск

Адкрытае акцыянернае таварыства «Паліграфкамбінат імя Я. Коласа».
Пасведчанне аб дзяржаўнай рэгістрацыі выдаўца, вытворцы, распаўсюджвальніка
друкаваных выданняў № 2/3 ад 04.10.2013. Вул. Каржанеўскага, 20, 220024, г. Мінск


Правообладатель Национальный Институт образования

## СТУЖКА ЛІТАР

| | | | | | | | | | | | | | | | | | | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| а | у | о | э | ы | в | й | л | м | н | р | ў | б | г | д | дз | дж | з | ж | | | | ь |
| я | ю | ё | е | і | | | | | | | | п | х | т | ц | ч | с | ш | ц | к | ф | |

## АЛФАВІТ

| | | | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|---|---|
| Аа а *Аа* | Бб бэ *Бб* | Вв вэ *Вв* | Гг гэ *Гг* | Дд дэ *Дд* | Ее е *Ее* | Ёё ё *Ёё* | Жж жэ *Жж* |
| Зз зэ *Зз* | Іі і *Іі* | Йй і нескладовае *Йй* | Кк ка *Кк* | Лл эл *Лл* | Мм эм *Мм* | Нн эн *Нн* | Оо о *Оо* |
| Пп пэ *Пп* | Рр эр *Рр* | Сс эс *Сс* | Тт тэ *Тт* | Уу у *Уу* | Ўў у нескладовае *ў* | Фф эф *Фф* | Хх ха *Хх* |
| Цц цэ *Цц* | Чч чэ *Чч* | Шш ша *Шш* | ы ы *ы* | ь мяккі знак *ь* | Ээ э *Ээ* | Юю ю *Юю* | Яя я *Яя* |

## ПРАВАПІС ГАЛОСНЫХ

| пад націскам | | не пад націскам |
|---|---|---|
| [о́], [э́]<br>*о, э* | → | [а]<br>*а* |
| мост<br>рэ́чка | | масты́<br>рака́ |

| пад націскам | | першы склад перад націскам |
|---|---|---|
| *е́, ё* | → | *я* |
| лес<br>клён | | ля\|со́к<br>кля\|но́вы |

Гук **[ў]** — зычны, гук **[у]** — галосны.
Гук **[ў]** — літара *ў* (у нескладовае).

Літара *ў*:
- пішацца пасля галосных
- не пішацца пасля знакаў прыпынку
- не бывае вялікай

## ПЕРАНОС СЛОЎ

| | | |
|---|---|---|
| адну літару не пераносяць, не пакідаюць на радку | ало-вак | за-вея |
| *ў* | дзяў-чын-ка | траў-ка |
| падоўжаныя зычныя | ка-лос-се | ка-ло-ссе |
| *дз, дж* | ра-дзі-ма | ура-джай |
| *й* | сой-ка | жа-лей-ка |
| ’ (апостраф) | пад’-ём | бур’-ян |
| *ь* | буль-ба | міль-ён |